

АД СУПЕР-КАМП'ЮТАРАЎ ДА КОСМАСУ

І СЛЁЗЫ, І РАДАСЦЬ 21




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 ЛІПЕНЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 124 (29493)


МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА

## БЫЦЬ ГАСПАДАРАМІ НА СВАЁЙ ЗЯМЛІ

*Дарагія суайчыннікі!*

*Ад усёй душы віншую вас з Днём Незалежнасці.*

*Галоўнае свята краіны ўвасабляе шматвяковую гісторыю барацьбы беларусаў за свабоду, за права жыць на роднай зямлі.*

*Глыбока сімвалічна, што гэтая дата гістарычна звязана з днём вызвалення сталіцы нашай Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У гады Вялікай Айчыннай вайны беларускі народ заплаціў мільёнамі жыццяў сваіх сыноў і дачок, абараняючы нашу будучыню. Гэты горкі вопыт навучыў нас берагчы мір, цаніць нацыянальнае адзінства, змагацца за дзяржаўнасць.*

*Беларусы заўсёды чэрпалі сілы ў духоўнай спадчыне продкаў, у іх працавітасці і самаадданасці. За намі стаяць многія пакаленні патрыётаў, стваральнікаў, пераможцаў. Мы не маем права іх падвесці, таксама, як мы ў адказе і перад нашымі нашчадкамі.*

*Перакананы, толькі беражліва захоўваючы памяць аб героях і прымнажаючы дасягнутае, беларусы заўсёды будуць заставацца гаспадарамі на сваёй зямлі і самі вызначаць уласны лёс.*

*Са святам, дарагія сябры!*

*Жадаю вам моцнага здароўя, міру і новых дасягненняў на карысць роднай Беларусі!*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**




# Беларусь маладая мая!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Абеліскі параненай зямлі



# СІМВАЛ СТОЙКАСЦІ І МУЖНАСЦІ

## Сёння цяжка ўявіць, што Курган Славы мог выглядаць інакш...

**Гэта святое для кожнага беларуса ўзвышша на 21-м кіламетры магістралі, якая вядзе з Мінска ў Маскву, цяжка праехаць або прайсці, не спыніўшыся. Мала хто ведае, што Курган Славы — гэта не проста помнік героям Вялікай Айчыннай вайны, манументальная падзяка ўдзельнікам пераможнай Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі «Баграціён», сімвал стойкасці і мужнасці беларускага народа. Акурат на гэтым месцы ў пачатку ліпеня 1944 года разгарнуліся жорсткія баі за вызваленне беларускай сталіцы...**

### МІНСКІ КАЦЁЛ

Тут, дзе сёння ўзвышаецца Курган Славы, была знішчана буйная групоўка праціўніка. Гісторыкі вайны пазней назавуць гэтае месца Мінскім катлом.

— 3 ліпеня 1944 года, у дзень вызвалення Мінска, воіны 1-га і 3-га Беларускіх франтоў замкнулі кола акружэння, у выніку чаго на ўсходзе ад горада ў «кацёл» трапіла 105-тысячная групоўка праціўніка, — расказвае **старшы навуковы супрацоўнік аддзела ваенна-франтавой гісторыі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Юлія КАЛТОВІЧ.** — У гранічна сціслыя тэрміны, за шэсць сутак, з 5 да 11 ліпеня, войскі 2-га Беларускага фронту і 31-й арміі 3-га Беларускага фронту раздзялілі на ізаляваныя часткі і разграмілі асноўныя сілы групы армій «Цэнтр». 70 тысяч гітлераўцаў было знішчана, 35 тысяч — трапіла ў палон, у тым ліку 12 нямецкіх генералаў.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X
21124>

З першых вуснаў

# «Мы не павінны страціць галоўнае — самога чалавека і ўсё чалавечае ў ім»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у пленарным пасяджэнні VIII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Удзел у пасяджэнні таксама прымаў і Прэзідэнт Расійскай федэрацыі Уладзімір Пуцін. Сёлета Форум рэгіёнаў прысвечаны тэме навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў эпоху лічбавізацыі.**

Вітаючы ўдзельнікаў форуму, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што традыцыйныя сустрэчы, якія праходзяць пад патранатам Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі, сталі найважнейшым эканамічным і камунікацыйным праектам Саюзнай дзяржавы.

«Беларусь падтрымлівае цесныя кантакты больш чым з сямюдзесяццю рэгіёнамі Расіі — ад Смаленска да Сахаліна. Кожны год Мінск прымае не менш за дзясятак дэлегацый на чале з расійскімі губернатарамі. Гэтыя факты і сама практыка работы форумаў рэгіёнаў пацвярджаюць, што на еўразійскай прасторы няма іншай маштабнай інтэграцыйнай пляцоўкі, дзе беларуска-расійскае супрацоўніцтва развівалася б так паспяхова», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Галоўнай адметнай рысай такіх сустрэч ён назваў змястоўны, зацікаўлены, адкрыты і вельмі карысны дыялог сяброў і партнёраў, прадстаўнікоў брацкіх народаў. А вынікі шматгадовай сумеснай працы цалкам рэальныя і выяўляюцца канкрэтнымі лічбамі.

«З асаблівым гонарам хачу паведаміць, што літаральна на днях уведзены ў прамысловую эксплуатацыю першы блок Беларускай АЭС. Праз год запрацуе другі. Безумоўна, гэта самы грандыёзны і паспяховы беларуска-расійскі праект апошніх дзесяцігоддзяў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён заўважыў, што гэта яскравае сведчанне таго, што ў беларусаў і расіян ёсць усе магчымасці і далей пашыраць эканамічныя, культурныя і проста сяброўскія сувязі.

## «Агульнымі намаганнямі мы справімся»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што супрацоўніцтва абедзвюх краін адбываецца на фоне росту напружанасці на міжнароднай арэне, дзе пакуль перавражаюць дэструктыўныя тэндэнцыі.

«Сур'ёзным выпрабаваннем на трываласць і праблемай нумар адзін у свеце стала пандэмія. У гэтых умовах Расія і Беларусь робяць усё магчымае, каб яе спыніць. Мы бачым, што расслабляцца пакуль рана. Аднак упэўнены: агульнымі намаганнямі мы справімся», — запэўніў ён.

Прэзідэнт Беларусі адкрыта падзякаваў Уладзіміру Пуціну за дапамогу ў барацьбе з каранавірусам, у прыватнасці за дапамогу з вакцынацыяй.

Беларускі лідар не пакінуў без увагі і геапалітычныя выклікі. Па яго словах, дзяржавы-лідары заходняга свету зрабілі стаўку на сілу — адкрыта ўмешваюцца ва ўнутраныя справы суверэнных дзяржаў, пастаянна мяняюць правілы гульні, ігнаруюць базавыя дамоўленасці.

«Мы бачым, якія намаганні прыкладае кіраўніцтва Расіі, каб захаваць далікатны баланс сіл на планеце. Аднак у Вашынгтоне і Брусэлі не заўсёды хочуць чуць канструктыўныя прапановы. Нашы апаненты тармозяць усе разумныя, пазітыўныя ініцыятывы і палітыкуюць новыя крызісы. Па сутнасці, наўмысна руйнуецца архітэктура бяспекі, створаная пасля Другой сусветнай вайны, за якую мы заплацілі 30 мільёнаў жыццяў савецкіх людзей» — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Таму мы падвяргаемся непрыкрытаму эканамічнаму і палітычнаму прэсінгу. Ён, магчыма, і не спатрэбіўся б, калі яны выйгралі б той бліц-крыг у жніўні. Разам з тым зразумела, што ўсе санкцыі — проста нахабныя спробы ліквідаваць эканамічных канкурэнтаў і накласці лапу на нашы рэсурсы. Захад нацэлены на стрымліванне развіцця, зрыў інтэграцыйных праектаў і змену курсу беларускай дзяржавы і не толькі», — сказаў беларускі лідар. У сувязі з гэтым ён падкрэсліў, што асаблівае значэнне набываюць умацаванне адзінства і пашырэнне супрацоўніцтва.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Уладзіміру Пуціну і ўсім расіянам за падтрымку ў барацьбе за захаванне суверэнітэту і незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

## Галоўны рухавік інтэграцыі

Гаворачы аб асноўнай тэме форуму — навукова-тэхнічным супрацоўніцтве, — Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што лічба даўно стала неад'емнай часткай нашай рэчаіснасці, і ў будучыні чалавецтва, напэўна, чакаюць яшчэ больш глабальныя перамены. Але кіраўнік дзяржавы перакананы, што ўсе яны павінны быць арыентаваны на развіццё рэальных вытворчасцяў і паляпшэнне жыцця людзей.

«Цалкам відавочна, што для краін, у якіх няма патрэбных рэсурсаў, адставанне ў лічбавых тэхналогіях пагражае непераадольнай няроўнасцю. Чалавецтва не павінна стаць заложнікам такой сітуацыі. Упэўнены, што нельга дапусціць дамінавання адных дзяржаў над іншымі. Таксама зразумела, што ніхто гэтыя тэхналогіі нам не дасць. Мы павінны разлічваць толькі на ўласныя сілы і кааперацыю. Менавіта прамысловая і навуковая кааперацыя бачыцца галоўным рухавіком нашай інтэграцыі», — заклікаў беларускі лідар.

Пры гэтым у рэальным вытворчым сектары беларускіх і расійскіх эканомік доля высокатэхналагічных вытворчасцяў, дынаміка росту вельмі недастатковыя. Беларускі лідар упэўнены, што павышэнню інавацыйнага патэнцыялу Беларусі і Расіі будзе спрыяць пераход да стварэння лічбавых платформ. Яны могуць стаць ключавымі інструментамі лічбавай трансфармацыі традыцыйных галін і рынкаў.

## «Ствараць новыя перспектывы для моладзі»

«Асобная тэма — стварэнне і выкарыстанне штучнага інтэлекту. У апошнія два-тры гады ў беларускім Парку высокіх тэхналогій імкліва развіваюцца дзясяткі кампаній, якія працуюць у гэтай сферы. І многія нашы IT-прадукты маглі б знайсці прымяненне ў Расіі, у тым ліку ў рэгіёнах», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Таксама ён звярнуў увагу на тое, што Парк высокіх тэхналогій паспяхова канкуруе на самых жорсткіх і патрабавальных рынках.

Пры гэтым беларускі лідар заўважыў, што ўніверсальнасць лічбавых тэхналогій, адсутнасць геаграфічнай прывязкі і шырокая даступнасць спараджаюць пытанне аб лічбавым суверэнітэце дзяржаў і іх інфармацыйнай незалежнасці. Вынікам гэтага працэсу ён назваў яшчэ адно поле для супрацоўніцтва, у якім Беларусі і Расіі трэба нарошчваць сумесныя намаганні, — забеспячэнне кібербяспекі.

«І Расія, і Беларусь ужо наўпрост сутыкнуліся з разбуральнымі наступствамі розных сеткавых тэхналогій, з дапамогай якіх у інтэрнэт-прасторы бескампрамісная барацьба за розумы і душы людзей. Гэта наша агульная пагроза, якой мы павінны навучыцца эфектыўна супрацьстаяць. Сёння, калі адкрываюцца дзверы ў новы свет, дзе разам з чалавечым ужо амаль на роўных праяўляе сябе штучны інтэлект, трэба памятаць, што мы не павінны страціць галоўнае — самога чалавека і ўсё чалавечае ў ім», — заклікаў Аляксандр Лукашэнка.

«Трэба больш прадметна займацца моладдзю, рэальна зрабіць маладзёжную палітыку адным з галоўных прыярытэтаў Саюзнай дзяржавы. Гадаваць стваральную моладзь — патрыётаў і творцаў, якія звязваюць з роднай зямлёй свой лёс і лёсы дзяцей. Ствараць для іх новыя перспектывы ў саюзнай адукацыйнай прасторы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Беларускі лідар канстатаваў, што Расія заўсёды была, ёсць і будзе стратэгічным партнёрам Беларусі. «Наш братэрскі саюз — гэта каштоўнасць, якую неабходна захаваць, прымножыць і перадаць будучым пакаленням. У гэтым наша місія, нашага пакалення, і мы ўсё для гэтага зробім».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін 1 ліпеня правялі тэлефонную размову, паведамілі ў прэсслужбе беларускага лідара.**

Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі супрацоўніцтва дзвюх краін у розных сферах, перш за ўсё з акцэнтам на гандлёва-эканамічны складальнік. Асобна Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін спыніліся на эканамічным узаемадзеянні ва ўмовах уведзеных санкцый. Было падкрэслена, што сумеснымі намаганнямі краіны змогуць пераадолець выклікі і пагрозы, якія ўзнікаюць.

Падрабязна прэзідэнты абмеркавалі пытанне аднаўлення транспартных зносін паміж Беларуссю і Расіяй. Кіраўнікі дзяржаў канстатавалі, што ўжо наладжаны пасажырскія авія- і чыгуначныя зносіны, адсутнічаюць праблемы ў сферы грузаперавозак. Адкрытае застаецца толькі пытанне зняцця абмежаванняў па перамяшчэнні грамадзян праз беларуска-расійскую граніцу аўтамабільным транспартам. Акрамя таго, абмяркоўваецца адкрыццё яшчэ большай колькасці рэйсаў «Белавія» ў Расію.

Падрабязна Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін спыніліся на развіцці ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва і пытаннях бяспекі. Таксама прэзідэнты абмеркавалі традыцыйны блок пытанняў: цэны на энерганосьбіты і доступ беларускіх тавараў на расійскія рынкі.

У час размовы прэзідэнты дамовіліся аб маючых адбыцца ў хуткім часе асабістых кантактах.

# «Аб'ядноўваючы свой патэнцыял, мы спрыяем умацаванню суверэнітэту і незалежнасці нашых краін»

Аб гэтым заявіла старшыня Савета Рэспублікі на пленарным пасяджэнні VIII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі

**— Форум стаў адной са знакавых падзей у жыцці дзвюх краін і традыцыйна выклікае цікавасць нашых брацкіх народаў. Дзякуючы яму ўмацоўваюцца як добрыя чалавечыя адносіны, так і міждзяржаўны дыялог, — падкрэсліла Наталля КАЧАНАВА.**

Яна звярнула ўвагу, што гэты ўнікальны праект сёння з'яўляецца эфектыўнай пляцоўкай для шырокамаштабнага міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння.

На думку спікера верхняй палаты парламента, важным з'яўляецца тое, што ў мерапрыемствах форуму прымае ўдзел моладзь: «Мы разлічваем, што маладзёжнае супрацоўніцтва стане важкім фактарам развіцця беларуска-расійскай інтэграцыі, будзе падсілкоўваць яе новымі ідэямі і ўмацоўваць справамі».

— Навука і інавацыі з'яўляюцца аднымі з ключавых фактараў забеспячэння нацыянальнай бяспекі. Аб'ядноўваючы свой патэнцыял, мы спрыяем умацаванню суверэнітэту і незалежнасці нашых краін, — перакланана Наталля Качанава.

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на тое, што зараз вядзецца падрыхтоўка дарожнай карты ў галіне фундаментальных даследаванняў. Сумесна з навукоўцамі Нацыянальнага даследчага цэнтра «Курчатаўскага інстытута» забяспечваецца цеснае супрацоўніцтва ў галіне ядзерных тэхналогій. Дзейнічаюць Камісія па фарміраванні адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы Саюзнай дзяржавы, Расійска-беларускі фонд венчурных інвестыцый.

У рэальным сектары эканомікі таксама ёсць чым ганарыцца: бакі сумесна ажыццяўляюць шэраг высокатэхналагічных і навукаёмістых праектаў. Пры гэтым важкі ўклад у іх рэалізацыю ўнеслі рэгіёны. У прыватнасці, расійскія спецыялісты стварылі інтэлектуальныя сістэмы кіравання беларускім кар'ерным самазвалам-беспілотнікам «БелАЗ». У Магілёве пабудаваны завод па вытворчасці тэхнічнага вугляроду.

У Петразаводску забяспечаны выпуск тэхнікі «Амкадор». Сталіцы абедзвюх краін злучыў хуткасны цягнік «Ластаўка». Таксама беларускі бок шчыльна ўзаемадзейнічае з расійскімі дзяржкарпарацыямі «Раскосмас» і «Расатам».

— Новыя магчымасці для рэальнага сектара эканомікі і сацыяльнай сферы адкрывае лічбавізацыя, — перакананa старшыня Савета Рэспублікі. — Лічбавы парадак дня актуальны для Беларусі ўжо шмат гадоў. Аляксандрам Лукашэнкам у 2017 годзе быў вызначаны стратэгічны курс на будаўніцтва IT-краіны. Шырока вядомы Дэкрэт кіраўніка дзяржавы аб развіцці лічбавай эканомікі.

— Як заканадаўцы, мы ўдзяляем асаблівую ўвагу даступнасці лічбавай прававой інфармацыі, пашырэнню пераліку дзяржаўных электронных паслуг, выкарыстанню інфармацыйных тэхналогій для грамадскага абмеркавання праектаў нарматыўных актаў. Усё гэта забяспечвае шырокія магчымасці для ўдзелу грамадзян у дзяржаўным кіраванні, — падкрэсліла яна.

Аднак на гэтым беларускі бок не спыняецца, а ставіць больш маштабныя задачы: укараніць лічбавыя тэхналогіі ва ўсе сферы грамадскіх адносін, дзе гэта можа даць станоўчы вынік.

Спікер верхняй палаты парламента звярнула ўвагу на тое, што лічбавізацыя — гэта не толькі «акно магчымасцяў», але і крыніца глабальных выклікаў.

— Кібертэхналогіі — магутная зброя, якая нярэдка выкарыстоўваецца ў супрацьпраўных мэтах. Але мішэнню з'яўляюцца не толькі асобныя грамадзяне, — акцэнтавала яна ўвагу.

Наталля Качанава патлумачыла, што стала рэальнасцю развязаная Захадам супраць нашых краін інфармацыйная вайна, масіраваны санкцыйны ціск. Іх мэта — аслабіць бакі, у тым ліку тэхналагічна. Яна ўпэўнена, што перад гэтымі агульнымі пагрозамі трэба згуртавацца як ніколі, і перакананa, што заканадаўцам трэба дзейнічаць на апярэджанне.

Спікер перакананa, што сумесная выпрацоўка падыходаў да рэгулявання лічбавай сферы дазволіць прымаць на нацыянальным узроўні ўзважаныя рашэнні. І прапанавала стварыць на двухбаковай аснове групу высокага ўзроўню як для прапрацоўкі пытанняў удасканалення заканадаўства ў гэтым кірунку, так і для пошуку шляхоў яго эфектыўнага ажыццяўлення.

— Нельга дапусціць, каб «лічбавая мэтазгоднасць» узяла верх над нашымі маральнымі і духоўнымі каштоўнасцямі, гістарычнымі традыцыямі. Сям'я, каханне, узаемная падтрымка, міласэрнасць, вера, Радзіма, патрыятызм, памяць аб мінулым, — сказала спікер верхняй палаты парламента, падкрэсліўшы: важна, каб хлусня і падмена паняццяў не зацямнілі праўды, а штучны інтэлект не абясцэніў ідэі гуманізму і не замяніў сабой простыя чалавечыя зносіны.

Гэтыя і многія іншыя праблемы лічбавізацыі бакам трэба будзе вырашаць разам, падкрэсліла яна, і ў тым ліку на такой пляцоўцы, як Форум рэгіёнаў.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

**Цягам апошняга года — вельмі няпростага для ўсяго свету — Беларусь не спыняла свайго развіцця, і сведчаннем таму стала ўвядзенне ў эксплуатацыю новых сацыяльна значных аб'ектаў: ад атамнай электрастанцыі, металапракатнага завода, мастоў, новых станцый метро да дзіцячых садкоў, музеяў і спартыўных збудаванняў. Усё гэта сведчыць пра тое, што мы навучыліся адказваць выклікам і годна выходзіць з крызісаў. Нагадаем толькі пра некаторыя знакавыя для людзей навабудоўлі ў кожным з рэгіёнаў краіны. Пра тое, чым можам па праве ганарыцца, што зрабіла наша жыццё больш камфортным, недзе духоўна ўзбагаціла, а недзе стварыла ўмовы для новых дасягненняў.**

## МОСТ ПРАЗ НЁМАН

**У Гродне пабудаваны самы высокі мост праз Нёман, які звяжа занёманскую частку горада з трасай М6. Аб'ект стаў найбуйнейшай будоўляй абласнога цэнтра апошніх гадоў. Ён узведзены на базе старога чыгуначнага моста, які стаяў доўгі час закінутым. Рэканструкцыя пачалася ў 2019 годзе па распараджэнні кіраўніка дзяржавы, аб'ект быў уключаны ў дзяржаўную інвестпраграму. Яго кошт склаў каля 150 мільёнаў рублёў.**



Фота БелТА

Гэта чацвёрты аўтамабільны мост праз Нёман у абласным цэнтры і адзін з самых высокіх у краіне — больш за 32 метры. У ходзе рэканструкцыі ён значна пашырыўся — з 4,5 метра да 17,5. Мост стаў чатырохпалосным, з шырокімі тратуарамі і веладарожкамі. Яго даўжыня — 240 метраў.

Старыя канструкцыі цалкам аднавілі. Маса сярэдняй апоры стала прыкладна 10 тысяч тон. Берагі ўзмацнілі габіёнамі — канструкцыямі, якія запоўнены камянямі. Такім чынам, ад старога чыгуначнага моста амаль нічога не засталося. Нядаўна тут прайшлі тэставыя выпрабаванні, на лакальным участку вымяралася нагрузка ў 200 тон. Спецыяльныя датчыкі правяралі вібрацыю і ўсе неабходныя паказчыкі.

Новы аўтамабільны мост — частка глабальнага праекта ў сферы дарожнага будаўніцтва. Генеральным планам Гродна прадугледжаны дарожны праект, які накіраваны на тое, каб звязаць розныя часткі горада і выйсці на трасу М6. Гэта павінна вырашыць і праблему аўтамабільных пробак.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

## САДОК У ШМАТПАВЯРХОВІКУ

**Дзіцячы яслі-садок, убудаваны ў жылы дом, з'явіўся ў Брэсце. На адкрыццё прыязджалі старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА і старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК. Матулі тады не хавалі сваёй радасці. Гэта ж мара любой мамы — па дарозе на работу не везці дзіця ў садок праз палову горада альбо нават на суседнюю вуліцу, а проста спусціцца з малым на першы паверх свайго ж дома і пакінуць яго ў групе.**

У жыхароў 10-павярховага дома па вуліцы Калесніка абласнога цэнтра такая магчымасць цяпер ёсць. Садок разлічаны на 75 месцаў. Прыярытэт атрымалі навасёлы дома, у якім садок з'явіўся. Гэта першая дзіцячая дашкольная ўстанова такога тыпу ў абласным цэнтры.

Будаўніцтва абышлося бюджэту ў 3 мільёны 500 тысяч рублёў. Узвялі садок будаўнікі КУП «Брэстжылбуд». Аб'ект здадзены ў эксплуатацыю ў лютым гэтага года. А ў самым канцы вясны ён расчыніў дзверы для выхаванцаў.

Для Брэста гэты праект стаў пілотным, а ў вобласці ўжо маецца падобны вопыт: у 2020 годзе ў жылым доме ў Драгічыне ўведзены ў эксплуатацыю ўбудаваны садок на 60 месцаў. Запланавана будаўніцтва такіх жа аб'ектаў у Іванаве, у Пінску, у Маларыце.

Дзіцячая ўстанова ў жылым доме зручная ва ўсіх кірунках, адзначалася падчас адкрыцця, калі попыт на месцы вялікі, ёсць магчымасць ушчыльняць групы, а калі праз гады патрэба ў садку адпадзе, яго нескладана перапрафіляваць пад іншы аб'ект.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ТРЭЦЯЯ ЛІНІЯ МЕТРО

**У лістападзе мінулага года ў Мінску была ўведзена ў эксплуатацыю першая чарга трэцяй лініі метро, якая злучыла праз цэнтр горада паўночныя і паўднёвыя яго раёны. У цырымоніі адкрыцця новай веткі браў удзел Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што ў складаны год нішто не спыніла будаўнікоў метро: ні пандэмія, ні заклікі да забастовак. «Бо вы былі занятыя справай, як і большасць беларусаў, дзякуючы якім краіна жыве, развіваецца, становіцца прыгажэйшай і больш утульнай», — звярнуўся ён да вінаўнікаў урачыстасці.**

Аб'ём перавозкі пасажыраў Мінскім метрапалітэнам за 2020 год склаў амаль 219 млн 290 тысяч. У суткі ў сярэднім паслугамі сталічнай падземкі карысталіся амаль 600 тысяч чалавек. Удзельная вага метрапалітэна ў перавозках камунальным пасажырскім транспартам складае больш за 36,4 %. Пасажырапаток чатырох новых станцый сталічнага метро складае ў сярэднім 10 тысяч чалавек.

Аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Аляксей Аўдонін назваў развіццё сеткі метро дэманстрацыяй эканамічнай развітасці дзяржавы. «Калі эканоміка дзяржавы стабільная, краіна можа рэалізоўваць такія буйныя праекты і, самае галоўнае, рэалізоўваць у кароткі перыяд часу», — сказаў ён. Будаўніцтва трэцяй лініі працягваецца, у лютым была завершана пракладка правага тунэля да будучай станцыі метро «Немаршанскі сад», даўжыня якога 1830 метраў. Тры новыя станцыі ў слуцкім кірунку плануецца ўвесці ў сярэдзіне 2023 года.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## ДЗІЦЯЧЫ ТЭХНАПАРК

**У Гомелі напярэдадні Дня Незалежнасці адкрылі дзіцячы «Інапарк» на базе новага модуля тэхнапарка «Карал». Першы модуль з офіснымі, лабараторнымі і вытворчымі памяшканнямі быў адкрыты год таму. За гэты час рэзідэнтамі тэхнапарка сталі сем юрыдычных асоб, якія займаюцца як ІТ-тэхналогіямі, так і вытворчай дзейнасцю. Заключана 12 дагавораў аб супрацоўніцтве з вядучымі ўстановамі вышэйшай, сярэдняй і дадатковай адукацыі, навуковымі ўстановамі і іншымі беларускімі тэхнапаркамі.**

— Гэты навукова-тэхналагічны парк — знакавы аб'ект, які стане важнай кропкай апоры для эканомікі не толькі Гомельскага рэгіёна, але і ўсёй краіны, — заявіў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.** — Пройдзе няшмат часу, і карціна інавацыйнай дзейнасці Гомельскага рэгіёна істотна зменіцца дзякуючы такім праектам.

Ён назваў «Карал» хуткасным трамплінам у будучыню. Падчас адкрыцця новага модуля кіраўніцтва тэхнапарка падпісала дагавор аб стварэнні на яго базе філіяла кафедры «Матэрыялазнаўства ў машынабудаванні» Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П. В. Сухога. Было абмеркавана і супрацоўніцтва з расійскімі кампаніямі, якія працуюць у сферы інфармацыйных тэхналогій.

Дзіцячы «Інапарк» — падраздзяленне Гомельскага абласнога цэнтра тэхнічнай творчасці дзяцей і моладзі — з верасня плануе прыняць звыш пяцісот юных наведвальнікаў. На дзень адчыненых дзвярэй сюды прыехала каля трох тысяч хлопчыкаў і дзяўчынак з Гомеля і раёнаў вобласці.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

## ФУТБОЛЬНЫ МАНЕЖ

**У Віцебску, безумоўна, адным з самых значных пабудаваных аб'ектаў сярод іншых за гады незалежнасці краіны стаў паветраапорны футбольны манеж. Збудаванне афіцыйна ўвялі ў эксплуатацыю ў верасні мінулага года — у рамках святкавання абласных «Дажынак», якія праводзілі ў сталіцы Падзвіння.**

Дзякуючы сучасным тэхналогіям тое, што калісьці здавалася толькі казкай, рэалізавана ў рэчаіснасці. Праекціроўшчыкі прадугледзелі, каб з манежа можна было, не выходзячы на вуліцу, прайсці ў кавярню, гасцініцу, раздзявалкі, трэнажорныя залы ЦСК. Такім чынам, ён стаў сучасным працягам маштабнай футбольнай лакацыі.

Памер поля стандартны для гульні ў футбол. На штучным пакрыцці, якое паклалі беларускія спецыялісты, можна трэніравацца нават у самыя лютыя зімы. Якасць ацанілі прафесіяналы і будучыя зоркі адной з самых папулярных спартыўных гульняў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## «РАЗУМНАЯ» ПАЛІКЛІНІКА

**Яна адпавядае ўсім патрабаванням сучаснасці і спалучае адразу некалькі медыцынскіх устаноў — дарослую і дзіцячую паліклінікі з асобнымі ўваходамі, жаночую кансультацыю, стаматалогію, рэабілітацыю, аддзяленні вода- і спелеалячэння, а таксама падстанцыю хуткай медыцынскай дапамогі.**




Фота mogilevnews.by

Магілёў стаў адным з першых гарадоў, дзе была рэалізавана праграма дзяржаўнай палітыкі па будаўніцтве інтэграваных паліклінік у рэгіёнах. Улічваючы, што мікрараёны «Казіміраўка» і «Спадарожнік» развіваюцца імклівымі тэмпамі, гэты аб'ект быў вельмі неабходны для іх жыхароў. Ён і будаваўся апераджальнымі тэмпамі — у тры разы хутчэй, чым планавалася.

Сяміпавярховік плошчай 16 тысяч квадратных метраў цалкам узброены сучасным медыцынскім абсталяваннем, тут сканцэнтраваны ўвесь неабходны рэсурс меддапамогі і рэалізаваны апошнія дасягненні ў гэтай галіне. Функцыянуе адкрытая рэгістратура, існуе электронная чарга, створаны кол-цэнтр. Усе даныя абследаванняў пацыента аўтаматычна трапляюць у яго электронную амбулаторную картку, а на лекі выдаецца электронны рэцэпт.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## БУДЫНАК ДЛЯ МУЗЕЯ

**Чэрвеньскі краязнаўчы музей атрымаў новы будынак, які быў узведзены ў рэкордна сціслыя тэрміны калектывам Будаўнічага ўпраўлення № 20 «Мінскпрамбуд».**

Новы аб'ект адрозніваецца ад папярэдняга не толькі маштабамі, але і прывабным знешнім выглядам, уладкаванай вакол тэрыторыяй. Ён удала ўпісаўся ў архітэктурны ансамбль горада, гармануе з суседнімі будынкамі і навакольным ландшафтам. У сучасным прасторным будынку на першым паверсе акрамя чатырох экспазіцыйных залаў размясціліся выставачная і канферэнц-зала, што дазволіла часцей мяняць экспазіцыі і такім чынам прыцягваць у музей больш людзей, збіраць іх на розныя пазнавальныя мерапрыемствы. А на другім паверсе ўладкаваны ўтульныя і камфортныя рабочыя кабінеты і фондазахоўванне.

Новы музей дае зусім іншыя магчымасці супрацоўнікам для рэалізацыі цікавых праектаў, задум, а наведвальнікам дазваляе больш глыбока спазнаваць багатую гісторыю краю.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Надвор'е

## Чэрвень стаў на 3-5 градусаў цяплейшы

### Ліпень пачынае нясмела

**У трэцяй дэкадзе чэрвеня ў краіне назіраліся інтэнсіўныя дажджы. Гэта былі часам ліўні на мяжы фолу. Аднак у цэлым за месяц на большай частцы тэрыторыі краіны адзначаецца недабор вільгаці, толькі месцамі па Мінскай, Гродзенскай, Віцебскай і Брэсцкай абласцях сума ападкаў за месяц дасягнула і нават перавысіла чэрвеньскую норму. У той жа час, па тэмпературным рэжыме чэрвень аказаўся цяплейшы за норму на 3-5 градусаў. А першы тыдзень ліпеня абяцае нам умерана цёплае надвор'е: гарачае сонца будзе «сябраваць» з дастатковай колькасцю дажджоў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Дастаткова інтэнсіўныя дажджы чакаюцца на працягу наступных сутак. На гэтым фоне крыху пахаладае. У суботу на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Месцамі прагназуюцца моцныя дажджы, навальніцы. Вецер чакаецца паўночна-ўсходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 13—19 цэлпа. Удзень паветра прагрэецца да 20—26 градусаў вышэй за нуль.

У далейшым чакаецца «высяпванне» наступнай хвалі цёплага паветра. У нядзелю ўначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Вецер будзе паўночна-заходні, паўночны ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 12 да 19 градусаў цяпла. Удзень чакаецца 21—27 градусаў вышэй за нуль. Пры павышанай вільготнасці такое надвор'е лічыцца ідэальным для росту агуркоў і памідораў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у сярэднім тэмпература ў першай дэкадзе ліпеня ў нашай краіне чакаецца на 3-4 градусы вышэйшая за кліматычную норму. У сераду зноў пачнецца цяжкі час начной духаты, калі тэмпература паветра будзе толькі крыху ніжэйшая плюс 20 градусаў. Удзень — да 30 цяпла і вышэй... Ліпень.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# СІМВАЛ СТОЙКАСЦІ І МУЖНАСЦІ



Працоўныя Мінска на насыпанні Кургана Славы.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Звыш 1600 чалавек за вызваленне Беларусі сталі Героямі Савецкага Саюза. Падчас баёў у Мінскім катле цаной уласнага жыцця здзейсніў подзвіг лётчык Барыс Акрэсцін, які, як і Мікалай Гастэла ў 1941-м, накіраваў свой самалёт на варожую тэхніку. Сувязістка Таццяна Барамзіна, якая да апошняга берагла даверaных ёй параненых вайскоўцаў, была расстраляна гітлераўцамі з супрацьтанкавай зброі. Артылерыст Мікалай Цяплоў апошняй гранатай узарваў сябе і фашыстаў, побач з якімі знаходзіўся. Да вызвалення Мінска заставаліся лічаныя гадзіны...

## УСЕНАРОДНАЯ СПРАВА

Увекавечыць подзвіг, а таксама памяць тых, хто загінуў на подступах да беларускай сталіцы, стала прыярытэтнай задачай пасляваеннага кіраўніцтва рэспублікі. Паўсюдна адбывалася добраўпарадкаванне брацкіх магіл і адзіночных пахаванняў, адзін за адным узнікалі помнікі і абеліскі, узводзіліся буйныя мемарыялы — сімвалы канкрэтных гераічных учынкаў і трагедый. А манумента, які б увекавечыў герояў Мінскага катла, так і не было.

І толькі ў пастанове «Аб добраўпарадкаванні месцаў пахаванняў воінаў Савецкай Арміі, партызан і мірнага насельніцтва, якія загінулі ў 1941—1945 гг., і аб увекавечанні знамянальных месцаў і падзей, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной на тэрыторыі Беларускай ССР», прынятай Саветам Міністраў БССР 8 красавіка 1959 года, прадпісвалася «на ўсходзе Мінска, у міжрэччы Бярэзіны і Свіслачы, на месцы Мінскага катла, у якім было знішчана 30 дывізій фашыстаў», устанавіць абеліск. Аднак вярнуліся да гэтага пытання толькі праз сем з паловай гадоў...

Першая жменька зямлі ў падножжа будучага помніка была кінута 30 верасня 1966 года. Узвядзенне Кургана Славы стала ўсенароднай справай. Тысячы людзей з розных куткоў Савецкага Саюза везлі сюды зямлю з мясцін, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны адбываліся жорсткія баі, дзе лілася кроў, дзе звычайныя людзі станавіліся героямі. З беларускай змяшалася і зямля, прывезеная з гарадоў-герояў: Масквы, Ленінграда, Валгаграда, Севастопаля, Кіева, Адэсы. Тут — і зямля з гераічнай Брэсцкай крэпасці.

## ЯК СТВАРАЎСЯ АБЕЛІСК

Сёння цяжка ўявіць, што Курган Славы мог выглядаць інакш. Быў аб'яўлены творчы конкурс на ўзвядзенне помніка. Першапачаткова разглядаўся праект, які ўяўляў сабой узгорак, дзе павінны былі расці тры дубы.

Архітэктар Алег Стаховіч, будучы вельмі амбіцыйным маладым чалавекам, быў незадаволены такім творчым рашэннем будучага Кургана Славы. Ён падзяліўся сваімі думкамі з сябрам, тады студэнтам апошняга курса тэатральна-мастацкага інстытута Анатолем Арцімовічам, якому таксама не падабаўся праект. Тады таварышы дамовіліся на працягу тыдня папрацаваць над сваімі варыянтамі будучага мемарыяла.

— Калі мы сустрэліся, Алег Стаховіч падзяліўся сваёй ідэяй кургана з колам, якое стаяла вертыкальна, як вянок, — расказвае адзін з аўтараў Кургана Славы, **заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Анатоль АРЦІМОВІЧ.** — У мяне з'явілася ідэя штыкоў. Першапачаткова іх было тры (чацвёрты, які сімвалізуе Прыбалтыйскі фронт, з'явіўся потым). Але на штыкі я чамусьці ўзняў імперскага арла, які сведчыў аб краху фашызму.

Сваімі задумкамі маладыя людзі падзяліліся з настаўнікам Арцімовіча Андрэем Бембелем. «Мы паказалі яму свае ідэі з прапановай, каб ён узначаліў наш калектыў, — успамінае скульптар. — Мы не верылі ў свае сілы. Мы былі надзвычай маладыя, а Андрэй Ануфрыевіч — ужо вядомы і аўтарытэтны майстар. Ён уважліва вывучыў нашы распрацоўкі, «зняў» арла, з ідэі Алега пасмяяўся: маўляў, што гэта за арба, куды яна коціцца. Гэта працверазіла нам галовы, і мы пачалі працаваць у яго майстэрні».

Аднак на пэўным этапе праца затармазілася. «Мы былі ў пэўнай разгубленасці: якія рабіць рэльефы, што там павінна быць? — расказвае Анатоль Арцімовіч. — Аднак не яны былі галоўныя. Галоўным было рашэнне ў цэлым Кургана Славы. Мы пачалі са штыкоў. Кола адразу не было. Бембель прапанаваў зрабіць камандны пункт, звонку якога прадугледжваліся барэльефы фігур. І вось аднойчы Андрэй Ануфрыевіч пачаў усур'ёз гаварыць аб пяхоце як царыцы ўсіх родаў войск. Так з'явілася галава пехацінца ў касцы. Гэта нас збянтэжыла, бо мы планавалі адлюстраваць фігуры, пэўныя падзеі. Але больш за ўсё нас турбаваў гэты камандны пункт. Аднойчы Алег Стаховіч купіў дзіцячага пластыліну, зляпіў з яго камандны пункт, які атрымаўся круглы. Я прапанаваў выцягнуць усё, што было ўнутры «каманднага пункта», і пакінуць адно кола, якое сімвалізуе вянок. Мы вырашылі яго звязаць са штыкамі...»



Пётр Машэраў і Фідэль Кастра падчас апошняга візіту ў Беларусь каля падножжа Кургана Славы ў ліпені 1972 года.

Мала хто ведае, што першапачаткова Курган Славы ўзводзіўся з правага боку шашы. Анатоль Арцімовіч успамінае, што там была сіласная вежа, якую яны меркавалі змясціць унутры скульптурнай кампазіцыі. Аўтарам помніка падавалася, што гэта павінна быць музейная частка з выхадам наверх. Калі ж яны пазнаёмілі са сваім праектам Пятра Міронавіча Машэрава, ён пасмяяўся і сказаў забыць пра гэтую сіласную вежу: яна, маўляў, старая і нікчэмная. Па правым баку шашы помнік знаходзіўся б супраць сонца. Машэраў жа прапанаваў узводзіць мемарыял на левым баку магістралі.

— Ідэя нам спадабалася, — гаворыць Анатоль Арцімовіч. — Пачалася новая валтузня. Мы сталі ляпіць галовы салдат. Нічога не атрымлівалася. І тады Андрэй Ануфрыевіч выказаў вельмі цікавую думку, што патрэбна адлюстраваць роды войск. Я пайшоў у ваенгандаль і купіў значкі з родамі войск. Прымацаваў іх на чырвоную стужку старэнькага паліто, паклаў перад сабой і ляпіў прадстаўнікоў радоў войск са знакамі адрознення. Яны вельмі ясна і хутка склалі ўсю кампазіцыю.

Нарэшце праект Кургана Славы быў зацверджаны ў абкаме партыі. Але атрымлівалася, што галовы, якія змяшчаліся на коле, былі крыху абрэзаныя. «Ахрэмчык, які быў старшынёй экспертнага савета, пасмяўся: што яны ў вас усе «бязмозглыя»? — успамінае мастак. — Але выходзіць за межы кола мы не хацелі. Таму ўсё так і засталося. Бембель толькі прапанаваў іх аформіць залатой смальтай. Гэта было цудоўнае выратаванне. Дзякуючы майстру, з'явіўся яшчэ і чацвёрты штык. Дарэчы, Андрэй Ануфрыевіч быў яркі насмешнік. Ён мог высмеяць так, што станавілася сорамна, і ты пачынаў думаць, як правільна гэта зрабіць. Гэтым талентам ён валодаў як ніхто. Дастаткова яму было сказаць, што арба коціцца, каб Стаховіч зразумеў, што ён зрабіў. Але «арба» выжыла, яна стала колам, вянком. Усе ідэі, з якімі мы прыйшлі да Бембеля, выжылі».

* * *

Адкрыццё Кургана Славы адбылося 5 ліпеня 1969 года. У гэты ж дзень з нагоды 25-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў адкрывалі і мемарыял у Хатыні. Сімвалічна, што сёння Курган Славы з'яўляецца філіялам мемарыяльнага комплексу «Хатынь».

У сваім першапачатковым выглядзе Курган Славы праіснаваў больш за тры дзесяцігоддзі. За гэты час стан мемарыяла па аб'ектыўных прычынах пагоршыўся. Таму, калі Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі прапанавала адрэстаўраваць помнік за ўласны кошт, аднаўленне мемарыяла мела дзяржаўны маштаб. Ужо праз год, у 60-ю гадавіну Вялікай Перамогі, Курган Славы набыў новае аблічча. Пасля рэканструкцыі яго адкрывалі прэзідэнты трох братэрскіх краін: Беларусі, Расіі і Украіны.

Для сённяшняга пакалення беларусаў Курган Славы — гэта сімвал памяці аб тых страшных гадах вайны, якая забрала кожнага трэцяга жыхара нашай краіны. Сімвал стойкасці і мужнасці нашых папярэднікаў, якія ахвяравалі сваімі жыццямі дзеля нашай светлай будучыні.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з архіва Белдзяржмузея гісторыі ВАв.**



**Удзельнік вызвалення Мінска Аляксандр ФЕНЬ *(у цэнтры)*, які напярэдадні Дня Незалежнасці заўсёды ладзіў экскурсію па месцах баёў за беларускую сталіцу, каля помніка (ліпень 2016 года).**

# У ГОНАР ЖАНОЧАГА ЛЁСУ І БЕЛАРУСКАСЦІ

**У райцэнтры Сянно, што на Віцебшчыне, маецца адзіны ў краіне помнік, прысвечаны Дзяржаўнаму сцягу. Ён цікавы тым, што ўшаноўвае звычайную вясковую жанчыну. Яго ўстанавілі ў 2015 годзе — у гонар Матроны Маркевіч (у дзявоцтве Кацар), якая вядомая як аўтар узору, узятага за аснову арнаменту на адным з галоўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь.**

Традыцыйна каля памятнага знака «Родны край» праводзяць патрыятычныя акцыі. «Звязда» неаднойчы распавядала і пра помнік, і пра Матрону Маркевіч, адну з многіх беларускіх жанчын з залатымі рукамі, і пра тое, як арнамент з рушніка, які яна стварыла, з'явіўся на сцягу. Лічыцца, што вышыла майстрыца яго аж у 1917 годзе.

Жыхары Сянно вельмі ганарацца тым, што іх зямлячка, звычайная сялянка родам з вёскі Клімавічы, маці семярых дзяцей, увайшла ў гісторыю як адна з аўтараў арнаменту. На ўроках краязнаўства мясцовыя дзеці зацікаўлена слухаюць пра гэтую жанчыну. Даведацца пра яе можна і ў Сенненскім гісторыка-краязнаўчым музеі. Матрона нарадзілася ў 1896 годзе. Пражыла цяжкае жыццё. Сама з сям'і заможных сялян. Калі стварыла сваю сям'ю, іх раскулачылі, а мужа з-за таго, што не хацеў уступаць у калгас, расстралялі. У ваенныя гады жанчына сышла да партызанаў і ў зямлянцы займалася ткацтвам: знайшла для гэтага ўсе інструменты і ніткі.

У час, калі яе старэйшы сын пайшоў у армію, менавіта ткацтва выратавала яе з дачкой Зінаідай ад галоднай смерці. Вырабы яны адносілі ў Сянно, дзе прадавалі або мянялі на ежу. Яшчэ ў 1951-м Матрона з дачкой жылі ў зямлянцы, майстрыха хварэла на рэўматызм. Памерла яна ў 1957 годзе. Пахавана ў Касцялішчах, у якіх жыла пасля таго, як выйшла замуж.

Арнамент ад Матроны ўпрыгожыў сцяг дзякуючы яе роднаму брату Міхаілу Кацару. Ён у 1951 годзе як загадчык секцыі этнаграфіі і фальклору беларускай Акадэміі навук атрымаў урадавае заданне распрацаваць новы ўзор сцяга краіны, каб той адрозніваўся ад сцягоў іншых савецкіх рэспублік.

Цікава, што фрагмент рушніка, зробленага сястрой, даследчык знайшоў у архівах «Белпрамсавета». Туды выраб трапіў у выніку адной з этнаграфічных экспедыцый. У супрацоўніцтве з беларускім жывапісцам, графікам Мікалаем Гусевым Міхаіл Кацар стварыў знакамітую выяву для сцяга БССР. Зроблены сястрой узор, які адлюстроўвае ўзыходзячае сонца, быў дапоўнены зашыфраванай выявай хлеба.

Матрона Маркевіч не ведала, што стала суаўтарам арнаменту на сцягу, бо не мела з братам стасункаў, каб не пашкодзіць яго навуковай кар'еры, бо лічылася жонкай «ворага народа».

Памятны знак на галоўнай плошчы Сянно нагадвае нам пра вытокі нашага нацыянальнага кода. Лёс Матроны — як люстэрка цяжкай долі, узор беларускага характару з яго шчырасцю, таленавітасцю і адкрытасцю свету.

Традыцыя ткаць рушнікі ў Сянно працягваецца. У пачатку чэрвеня ў раёне распачалі праект, прымеркаваны да Года народнага адзінства. У мясцовым Доме рамёстваў любы ахвотны можа далучыцца да стварэння рушніка-абярэга. Падказкі майстрых дапамогуць зрабіць на традыцыйным станку для ткацтва ўсё як мае быць: ад прытрымлівання ніткі да націскання на педалі. Задумана, што даўжыня гэтага калектыўнага твора будзе пяць метраў. Рушнік упрыгожаць сімваламі сонейка, дабрабыту, сілы жыцця... Плануецца паказаць яго жыхарам розных населеных пунктаў раёна. А ў фінале акцыі — ўрачыстая прэзентацыя твора.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

2 ліпеня 2021 г. № 25 (610)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

# КАНТАКТЫ ВЫЗНАЧАЮЦЬ КАНТРАКТЫ

## Больш за 80 рэгіёнаў Расіі ўдзельнічае ў міжрэгіянальным супрацоўніцтве з Беларуссю





Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.




Фота БелТА.

**Аб гэтым заявіў віцэ-спікер Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі Юрый ВАРАБ'ЁЎ падчас пасяджэння міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве.**

### Сярод краін СНД — першы гандлёвы партнёр

На палях VIII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі прайшло пасяджэнне МПК па міжрэгіянальным супрацоўніцтве.

— Нягледзячы на тое, што папярэдні VII Форум рэгіёнаў з-за пандэміі прайшоў таксама, на жаль, у такім усечаным фармаце, ён прынёс адчувальныя вынікі. Каля 80 расійскіх рэгіёнаў удзельнічае ў міжрэгіянальным супрацоўніцтве з Рэспублікай Беларусь. Актыўна развіваюць супрацоўніцтва з Беларуссю Рэспубліка Башкартастан, Самарская вобласць, Стаўрапольскі край, Курская вобласць, Рэспубліка Комі, Рэспубліка Кабардзіна-Балкарыя, Ненецкая аўтаномная акруга і іншыя. Напрыклад, на тэрыторыі Башкартастана дзейнічаюць 14 прадпрыемстваў, створаных пры ўдзеле капіталу з Беларусі, — адзначыў Юрый Вараб'ёў.

Ён расказаў, што ў цяперашні час абмяркоўваецца пытанне не толькі аб пашырэнні паставак у рэгіён беларускай аўтамабільнай, сельскагаспадарчай і будаўнічай тэхнікі, але і аб арганізацыі там яе зборкі. У Курскай вобласці налічваецца больш за 80 фірменных магазінаў беларускіх вытворцаў, а ў самім Курску Мазырскі домабудаўнічы камбінат будуе жылы комплекс «Беларускі квартал».

Акрамя таго, паспяхова рэалізоўваюцца і сумесныя праекты ў адукацыйнай і навуковай сферах.

— Напрыклад, Сыктыўкарскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Сарокіна падпісаў шэраг дакументаў аб супрацоўніцтве з трыма адукацыйнымі арганізацыямі Гродзенскай вобласці. І такіх прыкладаў выніковасці нашых міжрэгіянальных сувязяў можна прывесці яшчэ вельмі шмат, — адзначыў намеснік старшыні Савета Федэрацыі.

Па яго словах, актыўна развіваюцца гандлёва-эканамічныя сувязі паміж дзвюма краінамі. Па выніках мінулага года ўзаемны тавараабарот склаў 29,5 мільярда рублёў. Беларусь займае чацвёртае месца сярод гандлёвых партнёраў Расіі, а сярод краін СНД — першае. Расійскія інвестыцыі ў беларускую эканоміку летась перавысілі 4 мільярды рублёў. У прыватнасці, найбуйнейшым сумесным інвестыцыйным праектам з'яўляецца будаўніцтва Беларускай атамнай станцыі. Налета плануецца ўвесці ў эксплуатацыю яе другі блок.

Віцэ-спікер Савета Федэрацыі перакананы, што найважнейшым напрамкам інтэграцыйнага ўзаемадзеяння з'яўляецца рэалізацыя міждзяржаўных праграм, якія фінансуюцца ў тым ліку з бюджэту Саюзнай дзяржавы.

— За апошнія гады назапашаны значны станоўчы вопыт у гэтай сферы. Але ёсць, вядома, і вузкія месцы. Гэта датычыцца тэрмінаў і выніковасці выканання міждзяржаўных праграм, — звярнуў увагу Юрый Вараб'ёў.

Ён выказаў упэўненасць, што такі прадстаўнічы склад МПК дазволіць выпрацаваць канкрэтныя рашэнні па актуальных праблемах дзелавых сувязяў паміж рэгіёнамі нашых краін.

У сваю чаргу, **сустаршыня МПК па міжрэгіянальным супрацоўніцтве з беларускага боку, віцэ-спікер Савета Рэспублікі Анатоль ІСАЧАНКА** звярнуў увагу на тое, што, як і летась, пасяджэнне МПК праводзіцца ў рэжыме відэаканферэнцыі.

— З улікам бягучай эпідэмічнай сітуацыі — гэта найбольш рацыянальны і аптымальны фармат для камунікацыі. На палях VIII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі адбыліся секцыйныя пасяджэнні, дзе быў разгледжаны шырокі спектр тэм, прысвечаных пытанням лічбавізацыі ў розных сферах, а таксама па навукова-тэхнічным супрацоўніцтве дзвюх краін, — падкрэсліў ён. — Сённяшняе пасяджэнне міжпарламенцкай камісіі — гэта яшчэ адна магчымасць адкрыта абмеркаваць актуальныя пытанні двухбаковага ўзаемадзеяння і ролю рэгіёнаў у працэсе беларуска-расійскай інтэграцыі.

Віцэ-спікер Савета Рэспублікі перакананы, што Форум рэгіёнаў даказаў сваю выніковасць, выяўляе вялікую зацікаўленасць з усіх бакоў. Пра гэта кажуць тыя пагадненні і кантракты, якія падпісваюцца на палях форуму. Гэта тая пляцоўка, дзе сустракаюцца суб'екты рэгіянальнага гаспадарання, абмяркоўваюцца практыка прымянення існуючых заканадаўстваў і тыя праблемныя моманты, пытанні, якія перашкаджаюць далейшаму збліжэнню. Тады яны выносяцца на больш высокі ўзровень, дзе ўжо прымаюцца адпаведныя заканадаўчыя акты.

Адказваючы на пытанні журналістаў, Анатоль Ісачанка дадаў, што ва ўмовах санкцыйнага ціску з боку калектыўнага Захаду пытанні інтэграцыі, аб'яднання, уніфікацыі заканадаўстваў па асобных напрамках набываюць важнае значэнне.

*(Заканчэнне на 6-й стар.)*

АКЦЭНТЫ

# Маладзёжны парламентарызм: перспектыўныя прапановы для абодвух бакоў

**У рамках VIII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў Мінску і Маскве ў фармаце відэаканферэнцыі прайшло сумеснае пасяджэнне кіруючых органаў Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь і Палаты маладых заканадаўцаў пры Савеце Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі. У ходзе яго ўдзельнікі вызначылі перспектыўныя кірункі для сумеснага развіцця, механізмы развіцця маладзёжнага прадпрымальніцтва, узаемадзеянне рэгіянальных органаў маладзёжнага парламентарызму, а таксама падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве.**

**Старшыня Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь Ягор МАКАРЭВІЧ** адзначыў, што сёння дадзены гэты дыялог шмат у чым можа быць карысны нашым рэгіёнам і тым, хто сёння з'яўляецца прадстаўнікамі органаў маладзёжнага парламентарызму, дзеючымі дэпутатамі розных узроўняў.

— Маладзёжнае парламецкае ўзаемадзеянне Беларусі і Расіі выбудоўваецца ўжо на працягу сямі гадоў, у тым ліку на ўзроўні рэгіёнаў. Вельмі важна, каб рэгіянальны дыялог заставаўся ключавым складальнікам нашай работы. Нядаўна, напрыклад, сустракаліся з калегамі з Тамбова, Калінінграда. Гэтую практыку будзем працягваць. Тым больш што ў нас агульныя каштоўнасці, на якіх трымаюцца беларускі і расійскі народы: патрыятызм, гераічнае мінулае. І, вядома, гэта будучыня, якая аб'ядноўвае нас. Мы выдатна разумеем, што ва ўмовах тых глабальных выклікаў і пагроз, якія існуюць сёння, толькі з'яднаўшыся і рухаючыся наперад, зможам захаваць нашы каштоўнасці.

Беларуска-расійскае ўзаемадзеянне маладых заканадаўцаў вядзецца не толькі па лініі маладзёжнага парламентарызму, але і выбудоўваецца паміж маладзёжнымі грамадскімі арганізацыямі дзвюх краін: «Не першы год функцыянуе Беларуска-Расійскі саюз моладзі, які нацэлены на інтэграцыйны рух. А таксама Маладзёжная палата, якая працуе пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі. Усё гэта добрыя каналы камунікацыі нашай моладзі. Упэўнены, што такіх мерапрыемстваў і кантактаў мала быць не можа», — нагадаў Ягор Макарэвіч.

Падводзячы вынікі сумеснага пасяджэння, ён расказаў пра дасягненне пагаднення аб супрацоўніцтве і ўзаемадзеянні паміж маладымі парламентарыямі дзвюх краін.

— Яно прадугледжвае супрацоўніцтва ў інфармацыйнай сферы, стварэнне агульнай інфармацыйнай прасторы. Вельмі добрая прапанова прагучала адносна работы ў блогасферы, з лідарамі меркаванняў. Важна, каб гэтая работа праводзілася ў Беларусі і Расіі вельмі эфектыўна, — яна прадугледжвае стварэнне экспертнага цэнтра. Калегі з Расійскай Федэрацыі падтрымалі нашу прапанову, каб у наступным годзе ў рамках Форуму рэгіёнаў мы правялі беларуска-расійскі маладзёжны эканамічны форум. У нас вялікая колькасць маладых прадпрымальнікаў, а таксама тых, хто з'яўляецца маладымі кіраўнікамі ў дзяржаўных і прыватных арганізацыях у Беларусі і Расіі. Важна, каб і на ўзроўні моладзі эканамічныя кааперацыйныя сувязі выстройваліся. Сёння голас моладзі павінен быць пачуты і ў міжнародных арганізацыях, у тым ліку па грамадска-палітычнай абстаноўцы. Таму плануем, што пагадненне будзе максімальна прадукцыйнае, мы з калегамі настроены на работу. Усё тое, што мы намецілі, максімальна арыентавана на кожнага маладога чалавека як у Беларусі, так і ў Расіі. Усе астатнія прапановы, якія прагучалі на пасяджэнні маладых парламентарыяў дзвюх краін, будуць дэталёва вывучаны і прааналізаваны. У далейшым мы прапрацуем па іх дарожную карту. Расія — стратэгічны партнёр, і нам вельмі важна, каб усе нашы сумесныя ініцыятывы атрымалі практычнае развіццё.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# КАНТАКТЫ ВЫЗНАЧАЮЦЬ КАНТРАКТЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.)*

## Выхаванне патрыятызму і грамадскай адказнасці

На пасяджэнні ўдзельнікі разгледзелі выкананне выніковага дакумента папярэдняга VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, якія былі прысвечаны гістарычнай спадчыне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Як паведамілі ўдзельнікам пасяджэння **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, культуры, навуцы і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ**, нягледзячы на кароткі тэрмін (з моманту правядзення папярэдняга Форуму прайшло ўсяго дзевяць месяцаў. — **«МС»**) і няпростую эпідэмічную сітуацыю, асноўныя мерапрыемствы і праекты выкананыя.

— Як вы ведаеце, тэматыка VII Форуму рэгіёнаў была прысвечана гістарычнай спадчыне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ў звязцы з умацаваннем сацыяльных, эканамічных і гуманітарных адносін паміж народамі, — нагадаў сенатар. — І нам здаецца мэтазгодным структураваць работу, зробленую ў постфорумны перыяд, на наступных блоках.

Першы, прапанаваны старшынёй профільнай камісіі, блок датычыцца захавання гістарычнай спадчыны, а таксама супрацьдзеяння гераізацыі нацызму.

— Найважнейшым вынікам нашай работы ў прававым полі стала прыняцце закона «Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму», шраг нормаў якога сфармуляваны на аснове рэкамендацый, выпрацаваных падчас секцыйнага пасяджэння VII Форуму рэгіёнаў, — падкрэсліў Віктар Лісковіч.

Быў адкарэкціраваны і пакет законаў, якія рэгулююць медыйную сферу, дзейнасць сродкаў масавай інфармацыі. Нормы дадзенага закона забяспечваюць абарону ад супрацьпраўнага інфармацыйнага ўздзеяння і маніпулявання масавай свядомасцю. Таксама арганізавана работа па рассакрэчванні архіўных дакументаў, якія раскрываюць перадгісторыю Вялікай Айчыннай вайны і вядзенне баявых дзеянняў у яе пачатковы перыяд. Плануецца, што гэтыя дакументы стануць асновай экспазіцыі сумеснай перасоўнай выстаўкі, дэманстрацыя яе адбудзецца ў Беларусі і Расіі.

> Сёння кожны чацвёрты рухавік на нашым прадпрыемстве закупляецца ў Расіі. Адначасова недзе траціна нашай сельгастэхнікі пастаўляецца ў Расійскую Федэрацыю. Гэта прыклад кааперацыйных ланцужкоў, іх разгортвання.

Акрамя таго, рэалізоўваюцца глабальныя інтэрнэт-праекты. Дастаткова толькі згадаць «Лісты Перамогі», мэта якога — збор і размяшчэнне ў адкрытым доступе адзінай бібліятэкі лістоў ваенных гадоў. У гэтым жа шэрагу і інтэрнэт-пляцоўка «Партызаны Беларусі», на якой размяшчаюцца архіўныя матэрыялы бібліяграфічнага характару аб удзельніках партызанскай і падпольнай барацьбы.

Не спыняецца і пошукавая дзейнасць для высвятлення імёнаў вайскоўцаў, што загінулі, работа па пашпартызацыі іх пахаванняў, добраўпарадкаванні мемарыялаў і вайсковых магілак.

У прыватнасці, летась на дзяржаўны ўлік было прынята 101 ваеннае пахаванне, з пачатку бягучага года — 48 пахаванняў. Трэба сказаць, што ўсяго на дзяржаўным уліку знаходзіцца больш за восем тысяч ваенных пахаванняў і магілак ваенных ахвяр.

Выступоўца расказаў таксама, што ў аўтаматызаваны банк даных «Кніга Памяці Рэспублікі Беларусь» па выніках мінулага года былі ўнесены звесткі аб больш чым 14 тысячах вайскоўцаў, якія загінулі ці зніклі без вестак пры абароне Айчыны, а з пачатку года — амаль аб 1200 чалавеках. Дарэчы, усяго ў гэтым банку даных ёсць запісы аб месцах пахавання больш чым двух мільёнаў чалавек.

Другі блок праведзенай работы датычыцца прыняцця мер па выхаванні патрыятызму і грамадскай адказнасці.

— З пункту гледжання выхавання патрыятызму, асноўнай мэтавай групай з'яўляецца наша моладзь, — падкрэсліў сенатар. — Таму работа па гэтым трэку канцэнтруецца пераважна ў сферы адукацыі.

Так, ва ўстановах сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі Беларусі сёлета быў арганізаваны кінамарафон «Глядзі і памятай». Маладым людзям паказалі такія кінафільмы, як «Ідзі і глядзі», «Людзі з чорнымі душамі». Гэта вельмі моцныя кінастужкі, якія «без купюр» дэманструюць усе жахі вайны.

Да трэцяга блоку адносяцца прынятыя меры ў сферы гандлёва-эканамічных адносін.

— Эканамічны эфект ад міжрэгіянальнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі праяўляецца ў першую чаргу праз гандаль. Па выніках чатырох месяцаў гэтага года зафіксавана станоўчая дынаміка ўзаемнага тавараабароту, — адзначыў Віктар Лісковіч. — Тэмп росту склаў 131,9 %.

Для актывізацыі ўзаемадзеяння паміж рэгіёнамі толькі сёлета падпісана 20 міжрэгіянальных дакументаў аб супрацоўніцтве, беларускія арганізацыі ўзялі ўдзел у 30 кірмашах у расійскіх гарадах, у 36 выстаўках, форумах, прэзентацыях у расійскіх рэгіёнах.

— Працягваецца работа па ліквідацыі бар'ераў ва ўзаемным гандлі, у тым ліку па зняцці абмежаванняў доступу да дзяржаўных закупак, — падкрэсліў сенатар.

Ён растлумачыў, што ўрэгулявана праблема допуску беларускіх прадпрыемстваў да ўдзелу ў дзяржзакупках на тэрыторыі Расіі, вызначаны часовы парадак уключэння прадукцыі ў еўразійскі рэестр, што дазволіла аператыўна ліквідаваць гэты бар'ер.

## Палова беларускіх прадпрыемстваў працуе з расійскімі кампаніямі

У рамках міжпарламенцкай камісіі таксама абмеркавалі пытанні і перспектывы кааперацыі паміж суб'ектамі гаспадарання ў кантэксце імпартазамяшчэння, якое з'яўляецца важным складальнікам прамысловай палітыкі дзвюх краін.

— Для большасці прадпрыемстваў пляцоўка Форуму рэгіёнаў — гэта магчымасць паказаць сябе, прарэкламаваць, знайсці контрагентаў. Ну і заключэнне кантрактаў у рамках форуму — гэта стабільны вынік на будучыню. Гэта заўсёды магчымасць прыйсці ў наступным годзе і паказаць свой рост, — адзначыў **першы намеснік міністра эканомікі Юрый ЧАБАТАР.**

Паводле яго слоў, пляцоўка міжпарламенцкай камісіі па рэгіянальным супрацоўніцтве дазволіла абмеркаваць розныя тэмы.

— Перш за ўсё мы гаворым пра тыя прыярытэтныя напрамкі, якія ўласцівыя эканомікам нашых краін. Нас цікавяць тэмы лічбавізацыі, высокатэхналагічных вытворчасцяў, вядома ж, кааперацыйныя праекты. Тут у нас традыцыйна высокі патэнцыял. Мы кажам пра тое, што палова беларускіх прадпрыемстваў сёння працуе з расійскімі кампаніямі. Сёння кожны чацвёрты рухавік на нашым прадпрыемстве закупляецца ў Расіі. Адначасова недзе траціна нашай сельгастэхнікі пастаўляецца ў Расійскую Федэрацыю. Гэта прыклад кааперацыйных ланцужкоў, іх разгортвання.

У тым ліку мы гаварылі аб падтрымцы мерапрыемстваў і інфраструктуры для высокатэхналагічных вытворчасцяў, для стартап-мерапрыемстваў. Ёсць тэмы для работы з такімі прарыўнымі кірункамі, як фонд «Сколкава», у тым ліку з нашымі тэхнапаркамі, і адпаведныя мы вызначылі пункты і напрамкі супрацоўніцтва, — адзначыў у гутарцы з журналістамі першы намеснік міністра эканомікі Беларусі.

## Пераход да «зялёнай» эканомікі

Упершыню на палях форуму прысутнічала экалагічная тэматыка, паколькі асаблівае значэнне ў сучасным свеце надаецца экалагічнаму парадку дня. Сенатары прааналізавалі перспектывы сумеснай дзейнасці ў сферы аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў.

> По выніках мінулага года ўзаемны тавараабарот склаў 29,5 мільярда рублёў. Беларусь займае чацвёртае месца сярод гандлёвых партнёраў Расіі, а сярод краін СНД — першае. Расійскія інвестыцыі ў беларускую эканоміку летась перавысілі чатыры мільярды рублёў.

Як расказаў **міністр прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя Беларусі Андрэй ХУДЫК**, дзякуючы рэалізацыі праграмы Саюзнай дзяржавы «Развіццё сістэмы гідраметэаралагічнай бяспекі на 2017—2021 гады» створана і паспяхова функцыянуе сістэма кароткатэрміновага і звышкароткатэрміновага прагнозаў небяспечных метэаралагічных з'яў, праведзена мадэрнізацыя тэхналогій і спосабаў перадачы даных аб радыеактыўным забруджванні навакольнага асяроддзя, распрацаваны сцэнарыі для разліку трансгранічнага пераносу на сумежныя тэрыторыі Беларусі і еўрапейскай тэрыторыі Расіі ў выпадку хімічных і радыяцыйна-экалагічных аварый і гэтак далей.

— Прынятыя рашэнні вызначылі магістральны вектар развіцця і дзейнасці дзяржаўных гідраметэаралагічных службаў Беларусі і Расіі на найбліжэйшую і сярэднетэрміновую перспектыву, — патлумачыў ён.

Міністр таксама расказаў, што ў пытаннях сумеснай аховы і рацыянальнага выкарыстання трансгранічных вод арганізавана і функцыянуе сумесная беларуска-расійская кампанія па ахове і рацыянальным выкарыстанні трансгранічных водных аб'ектаў. Напрыклад, на чарговым пасяджэнні разгледжаны пытанні, звязаныя з кіраваннем воднымі рэсурсамі ў басейнах рэк Дняпро і Заходняя Дзвіна.

— У 2021 годзе кліматычны парадак дня і пераход да вуглароднай нейтральнасці як ніколі знаходзіліся ў цэнтры ўвагі сусветнага грамадства. Гэта падкрэслівае неабходнасць больш цеснай каардынацыі дзейнасці краін Саюзнай дзяржавы ў распрацоўцы адзінай палітыкі ў вобласці «зялёнай», цыркулярнай эканомікі, — падкрэсліў Андрэй Худык. — Забеспячэнне пераходу да шостага тэхналагічнага ўкладу, у якім «зялёныя» тэхналогіі з'яўляюцца прыярытэтнымі, павінна стаць ключавой мэтай сумеснай дзейнасці Беларусі і Расіі на найбліжэйшую пяцігодку.

Удзельнікі міжпарламенцкай камісіі таксама разгледзелі і прынялі рашэнне па праекце парадку дня наступнага, дзявятага па ліку, пасяджэння камісіі.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **Смолевичское районное потребительское общество, Минская обл., г. Смолевичи, ул. Советская, д. 133** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов (одним лотом) – КОМПЛЕКТ МАТЕРИАЛОВ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА МАГАЗИНА**
**Местоположение – г. Смолевичи, ул. Песчаная, 5**

| Наименование элементов деревянного изделия | Размеры, мм | Общая длина, п. м | Общий объем, куб. м |
|---|---|---|---|
| ОЦИЛИНДРОВАННАЯ ДРЕВЕСИНА | | | |
| Стеновая заготовка (h = 2,7 м) Оцилиндрованная древесина с выбранным пазом и зарезанными чашками | d 220 | 680 | 25,849 |
| СТРОПИЛЬНАЯ СИСТЕМА КРЫШИ (площадь кровли 88 кв. м) | | | |
| Стропильные ноги (6,8 м) – 14 шт. | 80 x 200 | 95,2 | 1,523 |
| Стропильные ноги строганные (6,8 м) – 4 шт. | 75 x 200 | 27,2 | 0,408 |
| Стропильные ноги строганные (крыльцо) (2,3 м) – 5 шт. | 60 x 160 | 11,5 | 0,11 |
| Контробрешетка – бруски | 25 x 80 | 133,9 | 0,268 |
| Обрешетка (шаг 300) | 30 x 100 | 330 | 0,99 |
| Лобовая доска строганная (2 ряда) | 22 x 100 | 40 | 0,088 |
| Торцевая доска строганная (2 ряда) | 22 x 100 | 60 | 0,132 |
| ПРОЧИЕ МАТЕРИАЛЫ | | | |
| Подкладочный брус | 50 x 160 | 38 | 0,304 |
| Нагеля (бруски березовые) (330 мм) – 714 шт. | 23 x 23 | 235,62 | 0,125 |
| Бруски монтажные для проемов | 40 x 40 | 24 | 0,038 |

**Начальная цена с НДС 20 % – 3 320,00 бел. руб.** (снижена на 80 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов 04.08.2021 в 11.00. Окончание торгов 04.08.2021 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приёма заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 02.08.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

# УРОКІ ПАНДЭМІІ ДЫ ІНТЭГРАЦЫЯ

**Пасяджэнне Савета дзелавога супрацоўніцтва гандлёва-прамысловых палат Расіі і Беларусі на тэму «Эканоміка Саюзнай дзяржавы. Урокі пандэміі і перспектывы развіцця інтэграцыі» прайшло паміж Мінскам і Масквой у рэжыме відэаканферэнцыі.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Гэта нармальная з'ява, калі колькасць паступова пераходзіць у якасць. У гэтым сэнсе стварэнне на базе дадзенага савета новай структуры — сумеснага Беларуска-Расійскага дзелавога савета, сведчыць аб жаданні абодвух бакоў развіваць інтэграцыю рэгіёнаў, знаходзіць сучасныя і эфектыўныя шляхі вырашэння праблем.

У рабоце савета ўзялі ўдзел і выступілі сенатары верхніх палат парламентаў Беларусі і Расіі. **Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ** адзначыла, што савет — сапраўды эфектыўная пляцоўка для абмеркавання актуальных пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва, перш за ўсё ў гандлёва-эканамічнай, прамысловай, інвестыцыйнай сферах. «Сёння, на этапе постковіднага аднаўлення і дзяржава, і бізнес вырашаюць складаныя задачы, каб выйсці на траекторыю ўстойлівага росту, паслядоўна развіваць свае канкурэнтныя перавагі, умацоўваць інвестыцыйны патэнцыял. І фактар інтэграцыі ў вырашэнні гэтых задач адыгрывае важную ролю», — сказала Таццяна Рунец.

У сваім выступленні **намеснік старшыні Камітэта Савета Федэрацыі па эканамічнай палітыцы Іван АБРАМАЎ** адзначыў, што адной з мэт пабудовы Саюзнай дзяржавы з'яўляецца стварэнне адзінай эканамічнай прасторы, рост ключавых эканамічных паказчыкаў, павышэнне інвестыцыйнай прывабнасці, мадэрнізацыя прамысловасці абедзвюх краін. А ў працэсе стварэння ўжо адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы лічбавізацыя ўяўляе сабой каталізатар аб'яднання краін. З гэтай нагоды рэалізоўваецца шэраг ініцыятыў як з боку бізнесу, так і дзяржаўнага сектара, а таксама сумесных навукова-тэхналагічных і інавацыйных праграм і праектаў. Бо эфектыўнасць працэсаў кааперацыі залежыць ад узроўню развіцця лічбавай эканомікі краін. Увогуле, уцягванне лічбавага бізнесу ў навукова-тэхналагічнае развіццё Саюзнай дзяржавы ў форме прыватных інвестыцый, сумесных навуковых праектаў, даследаванняў, стварэння дадатковых працоўных месцаў на тэрыторыі дзвюх краін будзе спрыяць больш эфектыўнай кааперацыі ў розных сферах, падкрэсліў сенатар.

Ініцыятарамі цяперашняй размовы на Савеце традыцыйна сталі Беларуская гандлёва-прамысловая палата і Гандлёва-прамысловая палата Расійскай Федэрацыі. Таму дыскусія, якая разгарнулася на пляцоўках, вялася ў асноўным вакол актывізацыі дзейнасці структур на фоне пандэміі. Невыпадкова кіраўнікі рэгіянальных гандлёва-прамысловых палат Беларусі і Расіі актыўна ўдзельнічалі ў размове, дзяліліся думкамі, выказалі прапановы па развіцці расійска-беларускага эканамічнага ўзаемадзеяння.

**Генеральны дырэктар Мінскага аддзялення Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Сяргей НАБЕШКА** звярнуў увагу на асобныя цяжкасці з выхадам беларускіх кампаній на расійскі рынак.

**Прэзідэнт Гандлёва-прамысловай палаты Бранскай вобласці Антаніна КАЦЯНІНА** заўважыла, што Беларусь — галоўны знешнегандлёвы партнёр яе рэгіёна. Палата ўжо працуе практычна з усімі аддзяленнямі Беларускай ГПП, а сёлета плануе падпісанне дагавора аб супрацоўніцтве з Брэсцкім аддзяленнем. Наладжаны абмен дзелавой і камерцыйнай інфармацыяй. Яна падрабязна расказала і аб тым, як ажыццяўляюцца ў Бранскай вобласці сумесныя праекты і развіваюцца механізмы ўзаемадзеяння з беларускімі партнёрамі.

**Старшыня Асацыяцыі міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў «БАМАП» Мікалай БАРАВЫ,** у прыватнасці, узняў пытанне аб вызваленні кіроўцаў-прафесіяналаў ад тэсціравання на каранавірус пры перасячэнні граніцы, калі на руках ёсць адпаведны сертыфікат. Дарэчы, **прэзідэнт Гандлёва-прамысловай палаты Расійскай Федэрацыі Сяргей КАТЫРЫН** падтрымаў гэтую прапанову, але толькі для кіроўцаў з краін СНД і ЕАЭС.

**Прэзідэнт Гандлёва-прамысловай палаты Маскоўскай вобласці Ігар КУІМАЎ** паведаміў, што прадпрымальнікі Маскоўскай вобласці вельмі зацікаўлены ў развіцці кантактаў з беларускімі калегамі. А таму палата заключыла дагаворы аб супрацоўніцтве з усімі аддзяленнямі Беларускай гандлёва-прамысловай палаты. На яго думку, змены ў фарміраванні беларускімі вытворцамі адпускных цэн маглі б рэзка павысіць попыт на беларускую прадукцыю ў Расіі, тавараабарот адразу павысіўся б, што было б выгадна абодвум бакам.

Агульны тэзіс: урокі пандэміі яшчэ і ў тым, што яе наступствы пераконваюць у відавочнай неабходнасці актывізацыі сумеснай работы па лініі гандлёва-прамысловых палат. Добрыя напрацоўкі ёсць. Гэта цеснае супрацоўніцтва нацыянальных палат, добрыя кантакты паміж тэрытарыяльнымі палатамі, выставы і кірмашы, сумесныя мерапрыемствы і праекты і г. д.

**Старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір УЛАХОВІЧ** падкрэсліў, што, нягледзячы на негатыўны ўплыў пандэміі і абмежаванні, якія яна ўнесла, бізнес па-ранейшаму гатовы рэалізоўваць узаемна выгадныя праекты на рэгіянальным узроўні. Поспех інтэграцыі Беларусі і Расіі будзе залежаць ад маштабаў сумесных праектаў паміж нашымі краінамі, паглыблення кааперацыі паміж суб'ектамі гаспадарання. Менавіта гэтыя кірункі могуць стаць асновай для далейшага супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы, лічыць Уладзімір Улаховіч.

Сяргей Катырын адзначыў актуальнасць размовы аб перспектывах эканамічнай інтэграцыі Саюзнай дзяржавы ў кантэксце ўрокаў пандэміі. Сёння даводзіцца працаваць у няпростых умовах. Але ўсё ж статыстыка гандлёвага абароту Расіі і Беларусі ў першым квартале 2021 года паказвае добры аднаўленчы рост адносна папярэдняга года — больш за 21 %. Безумоўна, падкрэсліў кіраўнік палаты Расійскай Федэрацыі, гэта добрая тэндэнцыя, якую трэба захаваць да канца года, а па магчымасці і палепшыць, гаварыў Сяргей Катырын.

Напрыканцы пасяджэння быў падпісаны шэраг пагадненняў аб супрацоўніцтве і камерцыйныя кантрактаў аб узаемных пастаўках прадукцыі беларускіх і расійскіх прадпрыемстваў хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці, будаўнічай галіны і г. д. Усяго заключылі кантрактаў прыкладна на 73 мільёны долараў ЗША.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**


## ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ВЕРЬ В СВОЮ УДАЧУ! ТУР 16»

КНИЖНЫЙ КЛУБ

Настоящие Правила проведения рекламной игры «Верь в свою удачу! Тур 16» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51, и определяют порядок проведения рекламной игры «Верь в свою удачу! Тур 16» (далее – Рекламная игра).

**1**. Организатор Рекламной игры.

Организатором Рекламной игры является Частное торговое унитарное предприятие «Книжный Клуб», УНП 690660411, зарегистрированное решением Минского областного исполнительного комитета от 30 марта 2015 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690660411 (далее – Организатор).

Место нахождения Организатора: Республика Беларусь, Минская область, Минский р-н, Новодворский с/с, д. 40, помещение 13а, р-н деревни Большое Стиклево.

Адрес электронной почты: info@bookclub.by

**2**. Наименование Рекламной игры: **«Верь в свою удачу! Тур 16»**.

**3**. Территория проведения Рекламной игры: Рекламная игра «Верь в свою удачу! Тур 16» проводится по всей территории Республики Беларусь.

**4**. Срок начала Рекламной игры: **5 июля 2021 года**.

**5**. Срок окончания Рекламной игры: **9 ноября 2021 года** (включая период розыгрыша и выдачу призов, опубликования результатов проведения Рекламной игры).

**6**. Комиссия по проведению Рекламной игры.

6.1. В целях объективного проведения Рекламной игры Организатором создается комиссия по проведению (далее – Комиссия) в составе пяти человек:

*1. Горелышева Наталья Михайловна, специалист по маркетингу Частного предприятия «Книжный Клуб» – председатель Комиссии,*

*2. Знак Кристина Александровна, заместитель директора по производству Частного предприятия «Книжный Клуб»,*

*3. Горбунова Елена Александровна, начальник информационной службы Частного предприятия «Книжный Клуб»*

*4. Позняк Виктория Георгиевна, начальник почтово-производственного отдела Частного предприятия «Книжный Клуб»,*

*5. Столяров Андрей Александрович, индивидуальный предприниматель Столяров А.А.*

**7**. Наименование товара, в целях стимулирования продажи которого проводится Рекламная игра: «Книга на каждый день», код товара 3080015 (далее Игровой товар) реализуемый в интернет-магазине организатора www.bookclub.by и посредством посылочной торговли.

**8**. Порядок участия в Рекламной игре.

8.1. Розыгрыш призового фонда рекламной игры проводится в семь этапов.

8.2. Для участия в каждом из этапов розыгрыша Рекламной игры покупатели должны выполнить следующие условия:

– заказать Игровой товар в указанные ниже сроки (включительно),

– оплатить заказ с Игровым товаром в указанные ниже сроки (включительно):

| Наименование этапа розыгрыша | Период осуществления заказа | Предельный срок зачисления платежа на р/с Организатора |
|---|---|---|
| Дни удачи 1 | 05.07.2021–15.07.2021 | 30.07.2021 |
| Дни удачи 2 | 19.07.2021–29.07.2021 | 13.08.2021 |
| Дни удачи 3 | 02.08.2021–12.08.2021 | 27.08.2021 |
| Дни удачи 4 | 16.08.2021–26.08.2021 | 10.09.2021 |
| Дни удачи 5 | 30.08.2021–09.09.2021 | 24.09.2021 |
| Дни удачи 6 | 13.09.2021–23.09.2021 | 08.10.2021 |
| Дни удачи 7 | 27.09.2021–07.10.2021 | 22.10.2021 |

Для участия в Рекламной игре достаточно приобрести один Игровой товар.

8.3. Заказ может быть осуществлен любым способом: на сайте – *www.bookclub.by*, по электронному адресу – info@bookclub.by, по почте – а/я 520, 220050, г. Минск, по телефонам – (017) 258-02-02, (029) 766-02-02, (044) 766-02-02, (025) 766-02-02, с понедельника по субботу с 9.00 до 21.00.

8.4. Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства. Члены Комиссии не могут быть участниками Рекламной игры.

**9**. Призовой фонд Рекламной игры.

Призовой фонд Рекламной игры формируется за счет имущества Организатора в размере 3 754 (три тысячи семьсот пятьдесят четыре) рубля 10 копеек.

Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы:

| Наименование этапа розыгрыша | Наименование | Кол-во, шт. | Цена за 1 шт., руб. | Общая сумма, руб. |
|---|---|---|---|---|
| Дни удачи 1 | Денежный приз 500 рублей | 1 | 500,00 | 500,00 |
| | Денежные средства в размере 52,30 рублей | 1 | 52,30 | 52,30 |
| Дни удачи 2 | ЖК телевизор Thomson T32RTE1160 | 1 | 460,00 | 460,00 |
| Дни удачи 3 | Сотовый телефон (абонентский терминал) Huawei Y6p модель MED-LX9N, цвет изумрудный зеленый, imei 860292046697241 | 1 | 436,43 | 436,43 |
| Дни удачи | Денежный приз 500 рублей | 1 | 500,00 | 500,00 |
| | Денежные средства в размере 52,30 рублей | 1 | 52,30 | 52,30 |
| Дни удачи 5 | Ноутбук ASUS X515MA-BR062 | 1 | 996,00 | 996,00 |
| Дни удачи 6 | Телевизор HYUNDAI H-LED32ET3001 | 1 | 480,00 | 480,00 |
| Дни удачи 7 | Сотовый телефон (с/тел.) SAMSUNG SM-A022G/DS, синий, 32GB | 1 | 996,00 | 996,00 |

**10**. Порядок проведения розыгрыша.

10.1. Розыгрыши призового фонда проводятся в следующем порядке:

– розыгрыши призового фонда проводятся по адресу: Минская область, Минский р-н, Новодворский с/с, д. 40, помещение 12а, р-н деревни Большое Стиклево, начало в 14.00;

– розыгрыши призового фонда всех этапов состоятся в следующие даты:

| Наименование этапа розыгрыша | Дата проведения розыгрыша |
|---|---|
| Дни удачи 1 | 02.08.2021 |
| Дни удачи 2 | 16.08.2021 |
| Дни удачи 3 | 30.08.2021 |
| Дни удачи 4 | 13.09.2021 |
| Дни удачи 5 | 27.09.2021 |
| Дни удачи 6 | 11.10.2021 |
| Дни удачи 7 | 25.10.2021 |

10.2. Розыгрыши призового фонда проводятся открыто, в присутствии Комиссии следующим образом.

К моменту каждого этапа розыгрыша призов данные об участниках рекламной игры формируются в Список участников (далее – Список) по дате и времени зачисления платежа на расчетный счет Организатора (всего семь списков).

Каждому участнику Рекламной игры в соответствующем Списке присваивается индивидуальный порядковый номер. Каждый участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии выполнения условий п.8.2. Если участник игры совершит несколько заказов, удовлетворяющих условиям п. 8.2, ему присваивается столько индивидуальных порядковых номеров в соответствующем списке, сколько таких заказов будет им совершено.

Если дата и время зачисления платежа у нескольких участников одного Списка совпадают, Список формируется по алфавиту.

Список обязательно содержит следующие поля: индивидуальный порядковый номер, клубный номер, номер заказа, дата заказа, дата и время зачисления платежа, сумма платежа, ФИО, адрес проживания.

Для розыгрыша используется лототрон и набор фишек. На каждой фишке нанесен индивидуальный порядковый номер. В лототрон помещаются фишки в количестве, равном количеству участников Рекламной игры согласно каждому Списку. Участник, выигравший приз, определяется случайным выбором, путем извлечения одной фишки из лототрона.

Номер извлеченной фишки считается выигравшим и вносится в протокол заседания Комиссии по проведению Рекламной игры.

В случае возникновения спорных ситуаций окончательное решение принимает Комиссия по проведению Рекламной игры.

**11**. Срок и способ информирования участников Рекламной игры.

О выигрышах в розыгрыше победители уведомляются заказным письмом и по телефону в течение 5 дней после проведения каждого розыгрыша.

**12**. Место, порядок и срок выдачи призов.

12.1. Денежный приз вручается победителю безналичным перечислением после получения от победителя необходимых данных о наименовании и реквизитах банка, номере банковского счета. Информация должна быть направлена Организатору любым удобным способом: по телефону, по почте, по e-mail, для этапа «Дни удачи 1» до 16.08.2021, для «Дни удачи 4» до 27.09.2021.

12.2. Денежный приз считается врученным победителю с момента перечисления денежных средств с расчетного счета Организатора на банковский счет победителя: для этапа «Дни удачи 1» по 17.08.2021, для «Дни удачи 4» по 28.09.2021 включительно.

12.3. За получением остальных призов победители должны явиться в офис Организатора по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. 40, помещение 12а, р-н деревни Большое Стиклево, с 9.00 до 17.00 в течение 15 дней после даты проведения каждого розыгрыша. Победитель должен предъявить паспорт.

В случае если победитель не может лично получить приз в офисе Организатора, его может получить доверенное лицо по предъявлении своего паспорта (вида на жительство) и доверенности, оформленной в установленном порядке.

Победитель может в течение 6 дней после даты проведения розыгрыша сообщить о своем желании получить приз иным образом: посредством курьерской доставки средствами любых почтовых операторов либо на пункте выдачи «Европочта».

Призы будут отправлены победителям за счет Организатора в течение 15 дней после даты проведения каждого розыгрыша.

Призы, отправляемые посредством почтовых операторов, считаются переданными победителям в момент передачи их в производство «Минская почта» РУП «Белпочта» или иным почтовым операторам.

12.4. В соответствии с Налоговым кодексом Республики Беларусь Организатор при вручении денежного приза выступает налоговым агентом и удерживает, и перечисляет сумму подоходного налога с дохода победителя (с денежных средств победителя).

12.5. Победители самостоятельно несут ответственность за уплату подоходного налога с физических лиц с сумм следующих призов: ноутбук ASUS, сотовые телефоны Huawei и SAMSUNG, телевизоры Thomson и HYUNDAI. Победители уплачивают подоходный налог с учетом установленных налоговых вычетов.

**13**. Особые условия Рекламной игры.

13.1. Призы замене не подлежат, выплата денежного эквивалента стоимости призов не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничивается исключительно указанными в настоящих Правилах количеством и видами призов. С момента передачи приза участнику к последнему переходят все риски и обязательства, связанные с владением, пользованием и распоряжением имуществом.

13.2. Факт участия в Рекламной игре подразумевает, что ее участники ознакомлены с Правилами и соглашаются с тем, что в случае победы их имена, отчества, фамилии, фотографии и интервью, связанные с Рекламной игрой, могут быть использованы Организатором Рекламной игры в любых рекламных и/или информационных материалах.

13.3. В случае если победитель отказался от приза, не получил его в установленные сроки, а также если не сообщил необходимые данные для перечисления денежного приза, приз остается в собственности Организатора.

**14**. Порядок информирования о результатах розыгрыша призового фонда.

14.1. Правила Рекламной игры подлежат опубликованию до начала ее проведения в газете «Звязда», а также размещаются на сайте Организатора *www.bookclub.by*.

Информация о результатах розыгрыша призового фонда Рекламной игры будет опубликована в газете «Звязда» до 4 ноября 2021 года, а также размещена на сайте Организатора *www.bookclub.by*.

14.2. Участники Рекламной игры могут уточнить информацию об участии и о проведении Рекламной игры по телефону информационной службы Организатора (017) 258-02-02 с понедельника по субботу с 9.00 до 21.00.

*Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4030 выдано 25.06.2021 Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

# НАВУЧЫЦЦА КІРАВАЦЬ ЛІЧБАВЫМ СВЕТАМ

## Тады вынік будзе на карысць стваральнага развіцця

**Такая думка прагучала падчас работы секцыі № 1 «Напрамкі развіцця расійска-беларускага супрацоўніцтва ў сферы навукі і адукацыі ў эпоху вялікіх выклікаў і лічбавых тэхналогій», якая прайшла ў рэжыме відэаканферэнцыі. Беларускія ўдзельнікі выйшлі на сувязь з расійскімі калегамі з Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў.**



### Кожны Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі — важная падзея

Аб гэтым заявіў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ.** Сенатар адзначыў, што Форум рэгіёнаў — гэта рэальная пляцоўка для прасоўвання партнёрскіх і дружалюбных адносін паміж нашымі дзяржавамі, каштоўны вопыт устанаўлення доўгатэрміновых кантактаў і сувязяў па розных пытаннях. На думку старшыні профільнай камісіі, такое супрацоўніцтва ўжо даўно паказала паспяховыя і прагрэсіўныя вынікі.

— Актуальнасць тэмы сённяшняга форуму абумоўленая асаблівым значэннем фарміравання адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы, паколькі ў цяперашні час ідзе станаўленне новай эпохі інфармацыйных тэхналогій практычна ва ўсіх сферах жыццядзейнасці чалавека, — растлумачыў Віктар Лісковіч. — Тэма лічбавізацыі вельмі актуальная і запатрабаваная з улікам вялікіх выклікаў, з якімі даводзіцца сутыкацца сучаснаму грамадству: пандэмія, інфармацыйная вайна, увядзенне санкцый і шэраг іншых пагроз.

У сваю чаргу, мадэратар работы тэматычнай секцыі з расійскага боку, **старшыня Камітэта Савета Федэрацыі па адукацыі, навуцы і культуры Лілія ГУМЕРАВА,** падкрэсліла, што правядзенне мерапрыемстваў у рамках Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі спрыяе вырашэнню задач любой складанасці.

Паводле яе слоў Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі мае вялікае значэнне для абедзвюх краін, садзейнічае вырашэнню задач любой складанасці ў барацьбе з пагрозамі нацыянальнай бяспекі, так званымі вялікімі выклікамі.

— У нашай студыі мы пастараліся аб'яднаць усе катэгорыі ключавых удзельнікаў расійска-беларускага ўзаемадзеяння. Шчыра спадзяюся, што абмеркаванне надасць новы імпульс развіццю сяброўскіх сувязяў народаў Расіі і Беларусі, будзе спрыяць далейшай канструктыўнай дзейнасці на карысць нашых дзяржаў, — перакананая старшыня профільнай камісіі.

Яна нагадала, што ў Расіі праходзіць Год навукі і тэхналогій:

— Сёння кіраўніцтвам краіны навука пазіцыянуецца як інструмент прарыўнога развіцця і павышэння глабальнай канкурэнтаздольнасці, забеспячэння сацыяльнага дабрабыту і эканамічнага развіцця.

На думку сенатара, пашырэнне кааперацыі і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва Расіі і Беларусі ў правільным выкарыстанні лічбавізацыі і лічбавых тэхналогій у навуцы і адукацыі мае стратэгічнае значэнне, спрыяе вырашэнню задач любой складанасці, барацьбе з пагрозамі нацыянальнай бяспецы, актуальнымі выклікамі.

Удзельнікі тэматычнай секцыі абмеркавалі найперш пытанні адукацыі, аховы здароўя, навуковага забеспячэння эканамічнага росту і сацыякультурнага развіцця, бо тыя вызначаюць канкурэнтаздольнасць і ўстойлівасць суверэнных дзяржаў, дабрабыт абодвух народаў. У цэнтры ўвагі былі і тэмы ўмацавання адзінства і даверу, развіцця ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва на аснове рэгулярных кантактаў паміж заканадаўцамі, урадамі, дзелавымі коламі, навукоўцамі нашых краін.

Трэба адзначыць, што краіны валодаюць значным навукова-тэхнічным і тэхналагічным патэнцыялам, які дазваляе заняць вядучыя пазіцыі ў свеце па многіх кірунках у сферы лічбавых тэхналогій. У рэгіёнах назапашаны вопыт па ўкараненні дадзеных тэхналогій у сферы дзяржаўнага кіравання.

Большасць рэгіёнаў Расіі і Беларусі ўдзельнічае ў сучасных адукацыйных і навуковых праектах. З 2000 года і да гэтага часу краінамі былі рэалізаваны 57 праграм Саюзнай дзяржавы па распрацоўцы новых тэхналогій і стварэнні інавацыйнай прадукцыі, у тым ліку 10 праграм у вобласці радыёэлектронікі, мікраэлектронікі, мікрасхематэхнікі, цеплавізійнай тэхнікі, чатыры праграмы ў сферы звышвысокавытворчай вылічальнай тэхнікі і праграмнага забеспячэння.

Нагадаем, што ў рабоце секцыі з беларускага боку бяруць удзел члены Савета Рэспублікі, кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, прадстаўніцтва высокатэхналагічных, навуковых арганізацый, кіраўнікі ўстаноў адукацыі.

> Адукацыйны працэс моладзі мы павінны выбудоўваць такім чынам, каб за лічбавізацыяй не прапусціць асобу, развіццё чалавека, яго ідэалагічныя перакананні, — падкрэсліў ён, падсумоўваючы вынікі работы секцыі. — Кожны малады чалавек, кожны грамадзянін нашай краіны, Расійскай Федэрацыі павінен любіць сваю Радзіму, сваю сям'ю і цаніць тое, што мае дзякуючы продкам, нашым прадзедам, якія далі нам магчымасць быць тымі, кім мы цяпер з'яўляемся. І мы ганарымся тым, што з'яўляемся нашчадкамі і паслядоўнікамі пераможцаў Вялікай Айчыннай вайны, якія аднаўлялі пасляваенную народную гаспадарку. Мы павінны прымножыць іх здабыткі і навучыць дзяцей карыстацца атрыманай спадчынай ды павялічваць яе.

### «Пункты росту» ў сферы лічбавізацыі

Але ці дастаткова намаганняў бакоў у эпоху лічбавай трансфармацыі грамадства?

Як адзначыў **дырэктар Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Алег МАКАРАЎ,** новыя выклікі, якія стаяць перад нашымі краінамі ў лічбавую эпоху, патрабуюць новых адаптыўных формаў маніторынгу абстаноўкі і выпрацоўкі адэкватных рашэнняў. Ён перакананы, што якасна новы ўзровень экспертна-аналітычнага суправаджэння не толькі інтэграцыйных працэсаў, але і звычайнага штодзённага суразвіцця якраз і стане тым рашэннем, якое шукаюць.

— Фонавай тэмай нашага форуму зяўлены разгляд інтэграцыйных працэсаў з папраўкай на лічбавую эпоху. Сапраўды, сёння, рэалізоўваючы любы сумесны праект па вывучэнні нашага грамадства, неабходна ўлічваць глабальныя інфармацыйна-тэхнічныя трэнды, — перакананы эксперт.

Да такіх трэндаў ён адносіць з'яўленне новых медыйных платформаў як часткі гістарычнага эвалюцыйнага працэсу.

— Сёння людзі прывязаны не да канала інфармацыі, а да свайго мабільнага тэлефона і тарыфнага плана на інтэрнэт. Чалавек сам вызначае, якую інфармацыю, калі, як і ў якім памеры ўжываць, — звяртае ўвагу Алег Макараў.

Ён адзначае, што традыцыйныя СМІ страчваюць дамінуючую ролю і цяпер знаходзяцца ў высокаканкурэнтным асяроддзі сацыяльных платформаў. Сацыяльныя медыя сёння — гэта тое асяроддзе, якое інтэнсіўна ўцягвае ў сябе ўсе каналы камунікацыі, лёгка транслюе любы інфармацыйны кантэнт і становіцца пляцоўкай для фарміравання парадку дня.

— Менавіта таму неўцягнутасць саюзных структур у працэс камунікацыі з дапамогай новых сродкаў непазбежна прывядзе да разрыву канала сувязі паміж дзяржавай і грамадствам, — кажа ён.

Эксперт нагадаў: тэндэнцыі апошніх гадоў сведчаць аб тым, што ў грамадстве сфарміраваўся запыт на аператыўны, лаканічны і эмацыянальны кантэнт, які прысутнічае на такіх пляцоўках, як YouTube, Instagram, TikTok і іншых. На гэтым фоне лічбавы медыйны свет характарызуецца больш шырокімі магчымасцямі і патрабуе новых формаў арганізацыі і кіравання працэсамі, якія адбываюцца.

Алег Макараў перакананы, што значны патэнцыял беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў сферы маніторынгу і аналізу інфармацыйнай прасторы ляжыць у сумеснай распрацоўцы праграмных прадуктаў па вывучэнні «вялікіх даных» і выкарыстанні тэхналогій штучнага інтэлекту.

— У гэтай сувязі можа быць выкарыстаны патэнцыял па лініі рэгіянальнага супрацоўніцтва, — адзначыў выступоўца. — Назапашаны вопыт і кампетэнцыі высокага ўзроўню рэгіянальных інфармацыйных цэнтраў Расіі і Беларусі дазволяць рэалізаваць сумесныя інавацыйныя праекты ў дадзенай сферы і могуць стаць новымі «пунктамі росту» для супрацоўніцтва ў сферы лічбавізацыі.



### Нашчадкі і паслядоўнікі пераможцаў

Наконт існуючых праектаў супрацоўніцтва ў сферы навукова-адукацыйнай дзейнасці выказаўся **прарэктар Магілёўскага дзяржуніверсітэта імя А. Куляшова Алег ДЗЯЧЭНКА,** які паведаміў, што за больш чым векавую гісторыю ВНУ падтрымлівае цесныя адносіны з расійскімі ўстановамі вышэйшай адукацыі і навуковымі цэнтрамі. Прычым развіццё міжнароднага супрацоўніцтва носіць тут стратэгічны характар і з'яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў дзейнасці.

— Яшчэ ў 2006-м наш універсітэт стаў членам Асацыяцыі ВНУ памежных абласцей Беларусі і Расіі. Стабільнай з'яўляецца дынаміка заключаных дамоў з установамі вышэйшай адукацыі Расіі. Усяго на дадзены момант заключана 31 дамова, што складае 36 % ад агульнай колькасці дамоў аб супрацоўніцтве з замежнымі ўстановамі адукацыі, — растлумачыў ён.

Безумоўна, такія праекты існуюць не толькі ў «памежных» ВНУ, але і ў іншых установах вышэйшай адукацыі абедзвюх краін. І як сведчыць народная мудрасць — няма мяжы ўдасканаленню.

У гутарцы з журналістамі мадэратар секцыі Віктар Лісковіч падкрэсліў, што сёння мы павінны навучыць дзяцей не толькі жыць у эпоху лічбавізацыі, але і кіраваць лічбавым светам, тады вынік будзе на карысць стваральнага развіцця.

— Адукацыйны працэс моладзі мы павінны выбудоўваць такім чынам, каб за лічбавізацыяй не прапусціць асобу, развіццё чалавека, яго ідэалагічныя перакананні, — падкрэсліў ён, падсумоўваючы вынікі работы секцыі. — Кожны малады чалавек, кожны грамадзянін нашай краіны, Расійскай Федэрацыі павінен любіць сваю Радзіму, сваю сям'ю і цаніць тое, што мае дзякуючы продкам, нашым прадзедам, якія далі нам магчымасць быць тымі, кім мы цяпер з'яўляемся. І мы ганарымся тым, што з'яўляемся нашчадкамі і паслядоўнікамі пераможцаў Вялікай Айчыннай вайны, якія аднаўлялі пасляваенную народную гаспадарку. Мы павінны прымножыць іх здабыткі і навучыць дзяцей карыстацца атрыманай спадчынай ды павялічваць яе.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

Сядзі і глядзі

# ПАЎЛІНКА І ШЛЮБНАЯ НОЧ

**Экранізацыі любімых твораў беларускіх класікаў зноў зможам убачыць у эфіры сацыякультурнага тэлеканала на наступным тыдні.**

Народная камедыя «Паўлінка» ад рэжысёра Аляксандра Зархі будзе чакаць сустрэчы з гледачамі ў сераду, 7 ліпеня. Кінастужка стала экранізацыяй спектакля Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы па аднайменным творы беларускага пісьменніка Янкі Купалы (1912). Змест гэтага твора кожнаму з нас знаёмы са школьных гадоў, але ўсё ж нагадаем. Паўлінка, дачка заможнага селяніна Сцяпана Крыніцкага, і настаўнік Якім Сарока кахаюць адно аднаго. Калі аднойчы пра гэта дазнаецца бацька дзяўчыны, то забараняе ёй бачыцца з маладым чалавекам. І каб разлучыць пару, ён ідзе з даносам у паліцыю: маўляў, у Якіма маецца забароненая літаратура. Паколькі Сцяпан Крыніцкі марыць парадніцца са шляхтай, то задумвае выдаць сваю дачку за знатнага жаніха — шляхціча Адольфа Быкоўскага. Але ж жаніх з «сюрпрызам», бо за кошт шлюбу жадае выправіць сваё незайздроснае матэрыяльнае становішча. І ў выніку перад закаханымі паўстае пытанне: ці змірыцца, ці збегчы разам, як тое прапануе Паўлінцы Якім? Выбар не з простых, але ж сэрца заўсёды ведае адказ.

У чацвер, 8 ліпеня, на экраны выйдзе псіхалагічная драма «Вясельная ноч». Фільм зняў на «Беларусьфільме» ў 1980 годзе рэжысёр Аляксандр Карпаў-старэйшы. У аснову кінастужкі лягла аповесць Івана Шамякіна «Шлюбная ноч». ...Летам 1942 года, у першы раз ад пачатку вайны, Валя ўбачылася са Сцяпанам. Ён аказаўся тым самым чалавекам з гарадскога падполля, да якога яна прыйшла. Так аднавілася іх каханне. Каб трапіць у горад, гераіня нават спецыяльна выпрошвала для сябе небяспечныя заданні. Летам 1943 года партызаны і падпольшчыкі рыхтавалі сумесную аперацыю па бамбардзіроўцы чыгуначных шляхоў, каб не дазволіць немцам перагнаць пад Курск і Арол ваенныя эшалоны. Для каардынацыі дзеянняў з Вялікай зямлёй у атрад прыляцае разведчыца Марыя. Але з моманту, калі Валя пазнаёміла Марыю са Сцяпанам, яна страціла спакой. А потым... трапіла на іх вяселле. Што кранае больш — драматычны фінал або ўменне герояў радавацца жыццю і каханню насуперак абставінам, кожны з нас няхай вырашыць для сябе сам.

Глядзіце і згадвайце любімыя творы, якія застаюцца заўсёды актуальнымі і не пакідаюць абыякавымі.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 123

Сваю новую задачу прапануе наш пастаянны чытач Міхаіл Кошаль з Мінска (*гл. дыяграму*).



**Белыя:** Kpb7, Фb3, Лh5, Cc8, Cd4, Kf5, Kg7, пп. d6, g2 (9).
**Чорныя:** Kpd5, Лс4, Лd1, Cg8, Kf2 (5).
Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Кампазіцыі Сяргея Дарошчанкі адрасаваны найперш шахматыстам-пачаткоўцам.

**№ 1**
Белыя: Kph8, Ла1, Cd1, Cg1, Kh4 (5).
**Чорныя:** Kph1, Фс3, Са5, Сс8, Kf6, пh2 (6).
Мат за 2 хады

**№ 2**
**Белыя:** Kpe7, Kh6, пп. f5, g4 (4).
**Чорныя:** Kph8, пп. g6, g7, h7 (4).
Мат за 3 хады.

* * *

Прапануем яшчэ некалькі партый сёлетніх чэмпіянатаў Беларусі.

Аляксей Аляксандраў — Арцём Сіняўскі.
1. d4 Kf6 2. c4 e6 3. Kc3 Cb4 4. f3 d5 5. a3 C:c3+ 6. bc 0-0 7. cd ed 8. e3 Cf5 9. Ke2 c5 10. dc Фa5 11. Kd4 Cg6 12. Фb3 Ф:c5 13. c4 Kc6 14. K:c6 Ф:c6 15. Cb2 Лac8 16. Лc1 Лfe8 17. Kpf2 Фe6 18. cd K:d5 19. Cc4 Л:c4 20. Л:c4 K:e3 21. Лb4 Kd5 22. Л:b7 Фe2+ 23. Kpg3 Ke3 24. Лg1 h5 25. h4 Kf5+ 26. Kph2 Фf2 27. Фa4 Kd6 28. Лb4 Лe4 29. Л:e4 C:e4 30. Лh1 C:f3 31. Лg1 Ke4 32. Фe8+ Kph7, 0:1.

Кацярына Бейненсон — Яна Ільючык.
**21.00** Розыгрыш рэкламнай гульні «Юбілейны ўраджай прызоў».
**21.25, 23.10 Серыял «За шчасцем» (12+).**
**23.30** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 6.45, 8.20, 16.20, 19.35, 22.15, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**6.10** Беларусы (6+).
**7.00** «Урачэбныя таямніцы плюс» (12+).
**7.30** Маршрут пабудаваны (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.30** Сфера інтарэсаў.
**8.55** «Навукаманія» (6+).
**9.30, 22.20** «НЗ.by».
**9.50, 10.20 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**12.00, 13.45 Серыял «Пяць хвілін цішыні. Вяртанне» (12+).**
**13.20** Надзвычайнае здарэнне.
**14.50** Пракурорская праверка (16+).
**16.25** Гісторыі выратавання (12+).
**16.55** «ДНК» (16+).
**18.00, 19.50 Дэтэктыў «Пёс» (16+).**
**21.10, 22.40, 23.45 Серыял «Закон» (16+).**
**0.05** «Справа ўрачоў» (16+).

## 8 канал

**7.00, 15.15, 17.35, 21.00, 1.00** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** «Мультпарад». «Скубі Ду і адгадай хто» (0+).
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Адкрыццё ведзьмаў» (16+).**
**8.20 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**9.05** Дак. фільм «Гравітацыя» (12+).
**9.30 Фантастыка «Цёмны рыцар. Адраджэнне легенды» (12+).**
**12.15 Серыял «Міс Марпл Агаты Крысці» (12+).**
**13.45 Серыял «Чыста англійскія забойствы» (12+).**
**15.20** «Мультпарад» (0+).
**16.05 Серыял «Чорнае каханне» (16+).**
**17.40 Серыял «Гэта мы» (16+).**
**19.05 Серыял «Мурка» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (6+).
**21.05 Драма «Тры гісторыі» (16+).**
**23.10 Драма «Стральцоў» (6+).**



## ВТБ

**6.05, 14.05** Раніца з гумарам (16+).
**8.00** Дурні і дарогі (16+).
**9.00** Лаві момант (16+).
**10.20** Зала чакання (16+).
**11.15** Серыял «Мамачкі» (16+).
**12.50** Наш рамонт (16+).
**13.25** Галерэя прыгажосці (16+).
**16.20** Дзіцячы КВЗ (6+).
**17.25, 1.35** Уральскія пельмені (16+).
**18.25, 3.25** Дзякуй богу, ты прыйшоў! (16+)
**19.30** Серыял «Вечны водпуск» (16+).
**20.30** Поўны блэкаут (16+).
**22.10** Камедыя «Таксі-2» (12+)
**0.00** Фантастыка «13-ы раён» (16+)
**4.20** «Масгарсмех» (16+).
**5.15** 6 кадраў (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква пісьменніцкая.
**7.05** Легенды сусветнага кіно. Марына Уладзі.
**7.35, 15.05** «Трынаццаць плюс...» Аляксандр Прохараў і Мікалай Басаў [СЦ].
**8.15, 15.45** «Забытае рамяство». Дак. серыял.
**8.35** «Дзень анёла». Маст. фільм.
**9.45** Колер часу. Рэнэ Магрыт.
**10.20** Шэдэўры старога кіно. «Песня пра шчасце». Маст. фільм.
**11.45** Да 265-годдзя Дзяржаўнага акадэмічнага Малога тэатра. Аляксандр Патапаў, Людміла Палякова і Барыс Няўзораў у спектаклі «Рэвізор».
**16.00** «Следства вядуць знаўцы». Маст. фільм.
**17.35** Раман у камені. «Іспанія. Тартоса». Дак. фільм.
**18.00** Майстры скрыпічнага мастацтва. Уладзімір Співакоў.
**18.45** «Леанід Енгібараў. «Сэрца на далоні». Дак. фільм.
**19.45, 1.55** Шукальнікі. «У пошуках магілы Мітрыдата».
**20.35** «Спявае Алена Камбурава». Творчы вечар.
**22.10** «Я цябе ненавіджу». Маст. фільм.
**23.50** «Мора ўнутры». Маст. фільм.
**2.40** «Дагані-вецер». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Спяем, сябры!» з Тацццянай Візбар. 2007 год (12+).
**6.55, 1.10** Фільм-спектакль «З запісак Лапаціна».
**7.40, 9.40, 11.00, 13.25, 15.40, 17.00, 18.00, 19.20, 20.45, 21.40, 23.30, 0.55, 2.15, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**8.10** Кінаканцэрт «На біс». 1988 год (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» з Уладзімірам Глазуновым.
**11.20, 17.20** Дак. фільм «Фарцоўшчыкі. Небяспечная справа». 2010 год (18+).
**12.00** «Фотаальбом Аляксандра Ліпніцкага». 2017 год (16+).
**13.35** «Пад знакам задыяка». 1992 год (16+).
**18.10** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. 2009 год (16+).
**19.35** Фільм-спектакль «Вера»
**22.00** «Колба часу» (16+).
**23.00** «Блеф-клуб». 1996 год (16+).
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Футбол у СССР». 2005 год (16+).

## EuroSport 1

**0.45** Ралі-рэйд. «Шаўковы шлях» (12+).
**1.00, 4.00, 9.30, 12.00, 13.00, 21.00** Веласпорт. «Тур дэ Франс» (12+).
**2.30, 7.00** Снукер. Чэмпіянат свету (6+).
**6.00** Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Зала славы» (12+).
**10.30** Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс H2H: Карл Льюіс — Усэйн Болт (12+).
**11.00** Веласпорт. «Джыра д'Італія» (12+).
**18.45** Формула Е. е-Пры Манака (12+).
**19.45, 20.15** Кузаўныя аўтагонкі (12+).
**22.45** Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Дарога ў Токіа» (12+).

## Кінакамедыя

**1.40** Монтэ-Карла (6+).
**4.20** Белыя цыпачкі (12+).
**6.20** Прышэльцы-2: калідоры часу (12+).
**8.35** Правілы здыму: метад Хітча (12+).



**10.45** Маска Зора (12+).
**13.20** Легенда Зора (6+).
**15.45** Гітлер капут (16+).
**17.35** Пацалунак на ўдачу (16+).
**19.30** Секс па дружбе (16+).
**21.30** Спявак на вяселлі (12+).
**23.15** Каляды з няўдачнікамі (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.25** «Паглядзім» (12+).
**10.00, 4.30** «Суд ідзе». Серыял (16+).
**11.05** «Паралельны свет» (12+).
**12.05, 18.00, 2.40** «Сляпая» (16+).
**13.10, 3.35** «Варажбітка» (12+).
**14.15** «Містычныя гісторыі» (12+).
**15.20** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**15.55** «Ведзьмакі свету» (16+).
**16.55** «Нечысць» (16+).
**19.35** «Звышнатуральны адбор» (16+).
**20.40** «Чалавек-невідзімка» (16+).
**21.45** Камедыя «Мой хлопец з заапарку» (12+).
**23.50** Ноч на ТБ3: «30 дзён ночы» (18+).
**1.55** «90-я» (16+).

## ТБ1000

**5.35, 6.15, 17.20, 18.10** Доктар Хаус (16+).
**7.10** Тры метры над узроўнем неба (16+).
**9.30** Тры метры над узроўнем неба: я цябе хачу (16+).
**11.45** Авіятар (16+).
**14.45** Адступнікі (16+).
**19.00** Чалавек-павук (12+).
**21.05** Чалавек-павук-2 (12+).
**23.15** Чалавек-павук-3 (12+).
**1.35** Сёмы сын (16+).
**3.15** Уладар стыхій (6+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.30** Алёша Паповіч і Тугарын Змей (12+).
**7.55** Ласкавы май (16+).
**9.55** Вайна полаў (16+).
**11.25** Золушка (16+).
**13.05, 14.00** Гурзуф (12+).
**15.00** Стылягі (16+).
**17.25** Тры волаты і Шамаханская царыца (12+).
**18.40** Тры волаты на далёкіх берагах (6+).
**19.55** Любоў-моркоў (12+).
**21.50** Любоў-моркоў-2 (12+).
**23.30** Бумер (18+).
**1.25** Бумер-2 (16+).
**3.10** На раёне (16+).
**4.40** Чорная маланка (6+).

## National Geographic

**6.00, 6.20** Зона будаўніцтва (16+).
**6.45** Незвычайныя прамыслы (16+).
**7.30** Інстынкт выжывання (16+).
**8.20** Інжынерныя ідэі (16+).
**9.15, 10.05** Аўта-SOS (16+).
**10.55** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**11.45, 16.00, 16.50** Ліхтугі за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).
**12.35** Востраў бунтароў (16+).
**13.25** Тэхаскі ўлоў (16+).
**14.15** Рыбы-пачвары (16+).
**15.05** Ліхтугі за мяжой (16+).
**17.40** Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
**18.30, 18.55, 5.40** Фабрыка ежы (16+).
**19.20, 20.10** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**21.00, 1.50** Чырвонае лета (16+).
**22.30, 22.55** Гарачыя межы: Лацінская Амерыка (16+).
**23.20** Мяжа (16+).
**0.15** Прарыў (16+).
**1.05** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха (16+).
**3.20** Атлас праклятых месяцаў (16+).
**4.05, 4.50** Дзённікі круізнага лайнера (16+).

## Discovery

**8.00, 17.42, 3.30** Гіганцкія хабы (12+).
**8.46, 16.48, 22.12** Махінатары (12+).
**9.39, 10.06, 20.24, 20.51** Багажныя войны (12+).
**10.32, 10.59, 15.00, 15.27, 21.18, 21.45** Як гэта уладкавана? (12+)
**11.25** Круты цюнінг (12+).
**12.18** Залаты прыіск Фрэдзі Доджа (16+).
**13.12** Залатая ліхаманка: Берынгава мора (16+).
**14.06** Сталёвыя хлопцы (12+).
**15.54, 1.47** Выжыць любой цаной (12+).
**18.36, 19.032.40, 3.05** Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).
**19.30, 4.15** Геній аўтадызайну (12+).
**23.06, 5.45** Смяротны ўлоў (16+).
**0.00, 6.30** Аперацыя «Выратаванне дома: ранча Рэйні» (12+).
**0.54, 7.15** Аэрапорт Варшавы (12+).
**5.00, 5.23** Як гэта зроблена? (12+)

## Беларусь 1

**6.00, 7.30, 8.30** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
**7.20, 8.20** Навіны эканомікі.
**7.25, 8.25** «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
**9.10 Серыял «След» (16+).**
**10.50** «Скажынемаўчы».
**11.45, 12.10, 13.05, 18.45, 19.20 Серыял «Таго, хто знайшоў, чакае ўзнагарода» (16+).**
**13.55** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**14.45, 15.25 Серыял «Чужая дачка». Заключная серыя (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Сэнс жыцця (12+).
**17.30** Маршрут пабудаваны (12+).
**18.15** «Зона Х». Вынікі тыдня (16+).
**21.00** Панарама.
**21.45** Клуб рэдактараў (16+).
**22.50 Серыял «Гатэль «Фенікс» (16+).**
**2.35** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 16.55** Тэлебарометр.
**9.05 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.05** «На нажах» (16+).
**11.10, 18.20 Серыял «Суфлёр». Заключныя серыі (16+).**
**13.15** «Тры першыя спатканні» (16+).
**14.05** Анімацыйны фільм «Гісторыя цацак-3: вялікія ўцёкі» (0+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**17.00 Серыял «Клон» (16+).**
**17.50** «Калі мы дома-2» (16+).
**20.20, 21.15** «Бітва экстрасэнсаў». Заключны выпуск (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**22.55 Баявік «Джон Картэр» (12+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Груца па-радзюкоўску.
**8.05, 12.00, 20.20, 23.50** Навіны культуры.
**8.25, 18.10 «Аляксандраўскі сад-2». Серыял (16+) [СЦ].**
**10.10** «Гісторыя Беларусі. Бітвы». Клецкая бітва.
**10.35** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**10.50, 16.25 «Вось такія цуды». Маст. фільм (12+) [СЦ].**



**12.20** «Сіла веры».
**12.45** «Я ведаю». Шоу-вікторына для ўсёй сям'і (6+).
**14.05, 21.05** «Апошні дзень». Тацяна Самойлава (12+).
**14.45, 21.40 «Штрафбат». Серыял. Заключныя серыі. (16+) [СЦ].**
**17.35** «Вітольд Цэраскі. «De rebus omnibus». Гісторыка-біяграфічны фільм (6+) [СЦ].
**19.55** «Жывая спадчына». Традыцыя прыгатавання «Поразаўскай банкухі».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.25** «Хатынь. Вайна без правіл». Фільм чацвёрты «Вогненныя пабрацці, заключны (12+).

## Беларусь 5

**6.55, 15.00** Тэніс. Уімблдон.
**9.30, 21.10** Лёгкая атлетыка. Маладзёжны чэмпіянат Еўропы.
**14.00** Аўтаспорт. Экстрым-Е.
**14.35** Вось гэта спорт!
**15.00** Тэніс. Уімблдон.
**21.00** Спорт-цэнтр.

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10, 9.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00,11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 00.50** Нашы навіны.
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**13.15, 23.00 Серыял «Забудзь і ўспомні» (16+).**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Трывожная кнопка» (16+).
**16.45, 18.20** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» (12+)
**18.55** «Поле цудаў» (16+).
**20.00** Час.
**21.10** «Dance Рэвалюцыя» (12+).

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 0.10** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.20, 20.45, 1.00** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.20** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40, 21.35** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.45, 16.50 «Шатун». Серыял (16+).**
**20.15, 23.15** «СТБ-спорт».
**20.20** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30** «Міншчына».

## МІР

**5.00, 10.20 Серыял «Маці і мачыха» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10** У гасцях у лічбы (12+).
**13.15** Справы судовыя. Грошы вярніце! (16+)
**14.10, 16.20** Справы судовыя. Бітва за будучыню (16+).
**15.05** Справы судовыя. Новыя гісторыі (16+).
**17.00 Маст. фільм «Амерыканская дачка» [СЦ] (12+).**
**19.15** Слабае звяно (12+).
**20.15** Тэлегульня «Гульня ў кіно» (12+).
**21.00** Сусветныя гульні розуму (12+).
**21.40 Маст. фільм «Ты — мне, я — табе» [СЦ] (0+).**
**23.30 Маст. фільм «Чалавек-аркестр» [СЦ] (12+).**
**1.15** Начны экспрэс. Сяргей Пенкін (12+).
**2.00 Маст. фільм «Цырк» (6+).**
**3.30** Мультфільмы [СЦ] (0+).

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.35** «Кропкі над «і» (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.40 Серыял «Касатка» (12+).**
**17.15** «60 хвілін».
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.45, 23.10 Маст. фільм «У палоне ў хлусні» (12+).**
**0.10** «Лёс чалавека».

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 6.45, 8.20, 16.20, 19.35, 22.10, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**6.10** Беларусы. (6+).
**7.00** «Урачэбныя таямніцы плюс» (12+).
**7.30** Маршрут пабудаваны (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.30** Сфера інтарэсаў.
**8.55** «Навукаманія» (6+).
**9.30** «НЗ.by».
**9.50, 10.20 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**12.00, 13.45 Серыял «Пяць хвілін цішыні. Вяртанне» (12+).**
**13.20** Надзвычайнае здарэнне.
**14.50** Пракурорская праверка (16+).
**16.25** Гісторыі выратавання (12+).
**16.55** «ДНК» (16+).
**18.00, 19.50 Дэтэктыў «Пёс» (16+).**
**21.05, 22.40, 23.45 Баявік «Дванаццаць гадзін» (16+).**
**22.15** «НЗ.by: час вынікаў».
**0.05** «Па следзе монстра» (16+).

## 8 канал

**7.00, 14.55, 19.00, 21.05, 1.00** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** «Мультпарад». «Скубі Ду і адгадай хто» (0+).
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Адкрыццё ведзьмаў» (16+).**
**8.20 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**9.05** «Удалыя парады».
**9.20 Фантастыка «Цёмны рыцар» (16+).**
**11.50 Серыял «Міс Марпл Агаты Крысці» (12+).**
**13.25 Серыял «Чыста англійскія забойствы» (12+).**
**15.00** «Мультпарад» (0+).
**15.45** «Гатуй як шэф» (12+).
**16.00 Серыял «Чорнае каханне» (16+).**
**17.30 Серыял «Гэта мы» (16+).**
**19.05 Серыял «Мурка» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (6+).
**21.10** «Героі коміксаў на экране» (16+).



## ВТБ

**6.05, 14.20** Раніца з гумарам (16+).
**8.00** Дурні і дарогі (16+).
**9.00** Лаві момант (16+).
**10.20** Зала чакання (16+).
**11.15, 21.30** Серыял «Мамачкі» (16+).
**12.50, 2.55** Серыял «Вароніны» (12+).
**16.20, 2.00** Серыял «Вялікая гульня» (16+).
**17.25** Уральскія пельмені (16+).
**18.25, 4.15** Дзякуй богу, ты прыйшоў! (16+)
**19.30, 0.00** Серыял «Вечны водпуск» (16+).
**20.30** Серыял «Зусім летнія» (16+).
**23.00** КВЗ. Па-нашаму (16+).
**1.00** Серыял «Маладзёжка» (16+).
**5.10** 6 кадраў (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**6.35** Святыні хрысціянскага свету. «Глава Іаана Хрысціцеля».
**7.05** Легенды сусветнага кіно. Віторыа Дэ Сіка.
**7.35, 15.05** «Сонца — пекла на нябёсах». Дак. фільм. [СЦ].
**8.35, 21.15** «У пошуках капітана Гранта». Маст. фільм.
**9.45** «Забытае рамяство». Дак. серыял.
**10.15** «Эрмітаж».
**10.45** «Паліглот». Нямецкая з нуля за 16 гадзін! № 3.
**11.30** Да 265-годдзя Дзяржаўнага акадэмічнага Малога тэатра. Ірына Мураўёва і Яўген Самойлаў у спектаклі «Лес».
**14.05** «Гісторыі ў фарфоры». Дак. серыял.
**14.30** Год Дастаеўскага. «Жыццё і смерць Дастаеўскага» [СЦ].
**16.00** «Следства вядуць знаўцы». Маст. фільм.
**17.30** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**17.50, 0.55** Майстры скрыпічнага мастацтва. Ісаак Стэрн.
**18.40, 1.45** «Эхаў грэка ... Падарожжа па сапраўднай Расіі». Дак. серыял.
**19.45** Больш, чым каханне. Леў і Валянціна Яшыны [СЦ].
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** «Тамара Сіняўская. Сцэны з жыцця». Дак. серыял.
**22.30** 85 гадоў Ігару Губерману. «Сумны жыццялюб». Дак. фільм.
**23.15** Колер часу. Густаў Клімт. «Залатая Адэль».
**23.50** Серыял «Шахеразада».
**2.30** «Глеб Плаксін. Супрацоўніцтва руская француза». Дак. фільм.

## Настальгія

**6.00** Маст. фільм «Шафёр на адзін рэйс».
**8.15, 9.40, 11.00, 12.55, 14.15, 15.40, 17.00, 19.40, 21.40, 23.00, 2.05, 3.40** Музычная настальгія (12+).
**8.30** Рытмічная гімнастыка. 1985 год (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» з Уладзімірам Глазуновым.
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Футбол у СССР». 2005 год (16+).
**13.10, 18.55** Фільм-спектакль «З запісак Лапаціна».
**18.00** «Спяем, сябры!» з Тацццянай Візбар. 2007 год (12+).
**20.10** Кінаканцэрт «На біс». 1988 год (12+).
**23.20** Дак. фільм «Фарцоўшчыкі. Небяспечная справа» (18+).
**0.00** Фільм-спектакль «Балалайкін і К».
**2.15** Кінаканцэрт «Па старонках амерыканскага кіно». 1991 год (12+).
**4.00** Маст. фільм «Арол і рэшка».
**5.25** «Блеф-клуб». 1996 год (16+).

## EuroSport 1

**0.15** Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс H2H: Джойнер-Керсі — Эніс-Хіл (12+).
**0.45, 4.00, 9.30, 11.30, 12.55** Веласпорт. «Тур дэ Франс» (12+).
**2.30, 7.00** Снукер. UK Championship (6+).
**6.00** Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Зала славы» (12+).
**10.30** Веласпорт. «Джыра д'Італія» (12+).
**19.00** Формула Е. е-Пры Эд-Дзір'і (12+).
**20.00** Аўтагонкі. Суперкубак Porsche (12+).
**22.00** Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс Beyond Human (12+).
**23.00** Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Бэн Джонсан — Злоўлены толькі праўдай» (12+).

## Кінакамедыя

**1.15** Ягуар (16+).
**3.00** Як выйсці замуж за мільярдэра (18+).
**4.40** Аднойчы ў Вегасе (12+).
**6.25** Васабі (16+).
**8.10** Сямейнае рабаванне (16+).
**9.50** Муві 43 (18+).
**11.40** Гітлер капут (16+).
**13.30** З рэчамі на вылет! (16+)
**15.10** Правілы здыму: метад Хітча (12+).
**17.20** Паляўнічы за галовамі (16+).
**19.30** Хто я? (12+).
**21.45** Каханне ад усіх хвароб (16+).
**23.45** Прышэльцы-2: калідоры часу (12+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**7.45** «Твой свет». (16+).
**9.40** «Перыскоп» (16+).
**10.00, 15.25, 4.30** «Суд ідзе». Серыял (16+).
**11.05, 3.40** «Паралельны свет» (12+).
**12.05, 18.25** «Сляпая» (16+).
**13.10, 19.35** «Варажбітка» (16+).
**13.45, 2.55** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.45** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**16.25** «Ганна — дэтэктыў-2». Серыял (16+).
**20.45** «Новы Амстэрдам». Серыял (16+).
**22.40** «Грань». Серыял (16+).
**23.40** «Глядзі сам» (16+).
**23.55** «10 самых» (16+).
**0.30** «Лінія абароны» (16+).
**1.05** «Пасажыры». (16+).

## ТБ1000

**5.00, 5.40, 17.20, 18.10** Доктар Хаус (16+).
**6.55** Гульні розумаў (16+).
**9.05** Абуджэнне (6+).
**11.10** Гульня ў хованкі (16+).
**12.55** Малая на мільён (16+).
**15.15** Мірны воін (12+).
**19.00** Маска Зора (12+).
**21.25** Легенда Зора (16+).
**23.35** Які выжыў (18+).
**2.20** Трэнер Картэр (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.05** На кручку! (16+)
**6.35, 16.20** Дабрыня Мікіціч і Змей Гарыныч (6+).
**8.25** На раёне (16+).
**10.00** Стылягі (16+).
**12.20** Глухар у кіно (16+).
**14.00, 14.55, 19.00, 19.55** Гурзуф (12+).
**17.35** Ілья Мурамец і Салавей-Разбойнік (6+).
**20.50** Пара з будучыні (12+).
**22.40** Самы Новы год! (16+)
**0.00** Як Надзя пайшла па гарэлку (18+).
**1.15** Адэса (18+).
**3.20** SOS, Дзед Мароз, або Усё збудзецца! (6+)
**4.50** Глухар у кіно (16+).

## National Geographic

**6.00, 6.20** Рабі стаўкі і ўзрывай (16+).
**6.45** Незвычайныя прамыслы (16+).
**7.35** Інстынкт выжывання (16+).
**8.25** Самыя лепшыя сунеркары (16+).
**9.15, 10.05** Аўта-SOS (16+).
**10.55** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**11.45, 16.50** Закінутыя гарады з Альбертам Лінам (16+).
**12.35** Вастраў бунтароў (16+).
**13.25** Тэхасці ўлоў (16+).
**14.15** Рыбы-пачвары (16+).
**15.05** Ліхтугі за мяжой (16+).
**16.00** Ліхтугі за мяжой: Злачынства і пакаранне (16+).
**17.40** Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
**18.30, 19.00, 5.35** Фабрыка ежы (16+).
**19.25, 20.10** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**21.00, 2.30** Непакорлівы востраў (16+).
**21.45** Каралі рыбалкі (16+).
**22.40, 23.05** Гарачыя межы: Лацінская Амерыка (16+).
**23.30** Мяжа (16+).
**0.20** Прарыў (16+).
**1.10** Экстрэмальныя падарожжа: Другая сусветная вайна (16+).
**1.55** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха (16+).
**3.15** Мегазлом (16+).
**4.00** Крывавыя таямніцы Еўропы (16+).
**4.45** Дзённікі кругазнага лайнера (16+).

## Discovery

**8.00, 17.42, 3.30** Гіганцкія хабы (12+).
**8.46, 16.48, 22.12** Махінатары (12+).
**9.39, 10.06, 20.24, 20.51** Багажныя войны (12+).
**10.32, 10.59, 15.00, 15.27, 21.18, 21.45** Як гэта ўладкавана? (12+)
**11.25** Круты цюнінг (12+).
**12.18** Узрываючы гісторыю (12+).
**13.12** Заканадаўцы тэхналогій (12+).
**14.06** Экспедыцыя ў Арктыку (16+).
**15.54, 1.47** Выжыць любой цаной (12+).
**18.36, 19.03, 2.40, 3.05** Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).
**19.30, 4.15** Геній аўтадызайну (12+).
**23.06, 5.45** Голыя і напалоханыя (16+).
**0.54, 7.15** Голыя і напалоханыя XL (16+).
**5.00, 5.23** Як гэта зроблена? (12+)

НАВУКА І ТЭХНАЛОГІІ

# АД СУПЕРКАМП'ЮТАРАЎ ДА КОСМАСУ

**На VIII Форуме рэгіёнаў абмеркавалі навукова-тэхналагічнае супрацоўніцтва Саюзнай дзяржавы. Секцыя № 2, пасяджэнне якой прайшло 29 чэрвеня, была прысвечана ролі лічбавізацыі ў фарміраванні адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы Саюзнай дзяржавы.**

«Актуальнасць гэтай тэматыкі відавочная. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, звяртаючыся з прывітальным словам да ўдзельнікаў міжнароднага форуму ТІБО-2021, адзначыў, што высокія тэхналогіі — гэта важная рухаючая сіла развіцця эканомікі, паляпшэнне якасці жыцця людзей. Лічбавая трансфармацыя ўсіх сфер грамадства з'яўляецца адным з нацыянальных прыярытэтаў Беларусі. Сапраўды, сёння ўмацаванне экспартнага патэнцыялу любой краіны практычна немагчымае без укаранення інавацый. Пры гэтым фактарам поспеху на макраўзроўні ў сферы высокіх тэхналогій часта становіцца паўнавартаснае супрацоўніцтва і кааперацыя з іншымі краінамі», — выступіла з прывітальным словам **мадэратар секцыі, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ.**

Яна расказала, што, дзякуючы супрацоўніцтву з расійскімі калегамі, у рамках саюзных праграм створана касмічная групоўка спадарожнікаў, распрацоўваюцца новыя тэхналогіі хірургічнага лячэння дзяцей з цяжкімі пашкоджаннямі пазваночніка, а таксама тэхналогіі вытворчасці збалансаваных кармоў для жывёл і мноства іншых распрацовак. Разам з тым, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах звярнула ўвагу на адзін трывожны сігнал. «Усяго за час існавання Саюзнай дзяржавы рэалізавана больш за 50 навукова-тэхнічных праграм. Летась — сем, у бягучым годзе — чатыры. Гэта трывожны сігнал, таму што ўсе праграмы завяршаюцца сёлета, і ў нас няма пераходных праграм для фінансавання ў наступным годзе», — адзначыла Таццяна Рунец.

## IT-платформа для адзінага рэестра

Падчас работы секцыі эксперты разгледзелі ключавыя падыходы да фарміравання адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы Беларусі і Расіі, у тым ліку і пытанні рэалізацыі сумесных навукова-тэхнічных праектаў. У прыватнасці, як паведаміў у сваім дакладзе **старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь Аляксандр ШУМІЛІН,** цяпер праводзіцца работа над стварэннем ІТ-платформы для адзінага рэестра тэхнапаркаў Саюзнай дзяржавы з наступнай распрацоўкай сістэм захоўвання, сістэматызацыі, аналізу і графічнай візуалізацыі даных. Гэтым займаецца Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Беларусі, Асацыяцыя кластараў і тэхнапаркаў Расіі і Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы. Па словах Аляксандра Шуміліна, выкарыстанне такой сістэмы ў Саюзнай дзяржаве даць магчымасць інвестарам выбіраць найбольш прывабныя ўмовы работы і аператыўна знаходзіць партнёраў для сумеснай дзейнасці.

«Сёння ў Беларусі створана сетка з 18 тэхнапаркаў, якія ахопліваюць усе рэгіёны нашай краіны і з'яўляюцца цэнтрамі прыцягнення новых вытворчасцяў і распрацовак. Таму супрацоўніцтва на рэгіянальным узроўні з Расіяй па гэтым кірунку мае вялікі патэнцыял», — адзначыў ён.

Для фарміравання адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы беларускія і расійскія навукоўцы ўжо рэалізавалі больш за 50 сумесных праграм. Асноўныя сферы — касмічныя тэхналогіі, мікраэлектроніка, інфармацыйныя тэхналогіі, машынабудаўніцтва, медыцына. Адныя з першых саюзных праграм сталі праграмы ў галіне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. У 2000 годзе пачалася распрацоўка новага пакалення суперкамп'ютараў сям'і СКІФ (Суперкамп'ютэрная ініцыятыва «Фенікс»), у выніку чаго быў створаны суперкамп'ютар 2 TFLOPS. На той момант ён уваходзіў у топ-100 самых высокапрадукцыйных камп'ютараў у свеце. Дадзеная работа атрымала працяг, і на базе сям'і суперкамп'ютараў створаны цэнтр калектыўнага карыстання ў Аб'яднаным інстытуце праблем інфарматыкі НАН Беларусі.

Летась была завершана знакавая навукова-тэхнічная праграма «Аўтаэлектроніка», якая прадугледжвала стварэнне новага пакалення электронных кампанентаў для сістэм кіравання і бяспекі аўтатранспартных сродкаў спецыяльнага і двайнога прызначэння. «Вынікі праграмы выкарыстоўваюцца пры стварэнні рабатызаваных беспілотных кар'ерных самазвалаў БелАЗ, якія ўжо працуюць на кар'ерах Сібірскай вугальнай энергетычнай кампаніі», — расказаў Аляксандр Шумілін. Для павышэння эфектыўнасці апрацоўкі даных дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі рэалізоўваецца праграма Саюзнай дзяржавы ў касмічнай галіне — «Інтэграцыя — СД».



Фота БелТА.

У працэсе распрацоўкі знаходзіцца шэраг новых праектаў канцэпцый праграм. У будучым яны дапамогуць стварыць сучасныя тэхналогіі выяўлення і пераадолення ўстойлівасці мікраарганізмаў да лекавых прэпаратаў (праграма «Пераадоленне») і новыя медыцынскія клетачныя прадукты («Саюзбіямембраны»). Таксама ў планах — стварэнне тэхналогій, матэрыялаў і абсталявання для 3D-друку («Адытыўнасць»), распрацоўка комплексу на аснове звышправодзячых рэзанатараў («Паскаральнік-ЗПР») і інавацыйных тэхналогій развіцця фатоннай кампанентнай базы Саюзнай дзяржавы («Кампанент-Ф»). Таксама ў фінальнай стадыі ўзгаднення праекта канцэпцыі — новая праграма ў галіне космасу: «Комплекс-СД».

## Супрацоўніцтва са «Сколкава»

**Намеснік міністра эканомікі Рэспублікі Беларусь Юрый ЧАБАТАР** расказаў пра планы ў 2022 годзе ўвесці ў эксплуатацыю доследна-дэманстрацыйны цэнтр у Брэсцкім навукова-тэхнічным парку. З мінулага года Міністэрства эканомікі ў партнёрстве з ААН па прамысловым супрацоўніцтве (ЮНІДО) працуе над праектам, які прадугледжвае стварэнне пілотнага доследна-дэманстрацыйнага цэнтра развіцця смарт-індустрыі на базе Брэсцкага навукова-тэхнічнага парка. Гэты праект павінен унесці ўклад у забеспячэнне пераходу Беларусі да тэхналогій чацвёртай прамысловай рэвалюцыі, павысіць узровень ведаў пра даступныя тэхналогіі смарт-індустрыі і панізіць бар'еры для ўкаранення такіх тэхналогій. Адпаведна, з дапамогай дадзенага праекта павысіцца кваліфікацыя спецыялістаў і ўдасканаліцца інфраструктурная база. «Мы разлічваем, што цэнтр стане важнай пляцоўкай для супрацоўніцтва з фондам «Сколкава», а сам Брэсцкі тэхнапарк атрымае статус цэнтра камерцыялізацыі інавацый і будзе выступаць аператарам «Сколкава» ў заходнім рэгіёне Беларусі. У выпадку поспеху праекта ў нас ёсць намеры маштабіраваць яго на двух прыгранічных з Расіяй рэгіёнах — Магілёўскай і Віцебскай абласцях», — дадаў намеснік міністра.

Праект пагаднення паміж Міністэрствам эканомікі Беларусі і фондам «Сколкава» аб супрацоўніцтве ў галіне інавацыйнага, лічбавага і кластарнага развіцця цяпер знаходзіцца ў заключнай стадыі. Пагадненне прадугледжвае сумесную работу па рэалізацыі дзелавых і прафесійных ініцыятыў у сферы інавацыйнага і лічбавага развіцця. Згодна з ім, стартапам і інавацыйным кампаніям будуць дадзены магчымасці карыстацца ў «Сколкава» сэрвісамі экспертызы, інфармацыйнай падтрымкі, прасоўвання на рынку і пошуку партнёраў.

«Мы разлічваем, абапіраючыся на ўнікальны вопыт фонду і патэнцыял беларускіх інавацыйных кампаній і тэхнапаркаў, знайсці пункты спалучэння пры рэалізацыі рэзідэнтамі Беларусі пілотных праектаў у сферы лічбавага развіцця дзвюх краін. Сёння нашым дзяржавам патрэбныя спалучаныя інавацыйныя і вытворчы патэнцыялы. Трэба ісці і далей па шляху рэалізацыі сумесных праектаў», — упэўнены Юрый Чабатар.

З 2019-га Міністэрства эканомікі рэалізоўвае шэраг праектаў міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне стварэння інфраструктуры падтрымкі развіцця смарт-індустрыі ў Беларусі. Ужо выкананы комплекс работ па ацэнцы гатоўнасці нацыянальнай эканомікі да лічбавай трансфармацыі. Вынікам згаданага праекта сталі рэкамендацыі, якія прадугледжваюць распрацоўку стратэгіі, накіраванай на супрацоўніцтва буйных вытворчых кампаній з суб'ектамі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. А таксама былі ўкаранёны новыя інструменты дзяржаўнай падтрымкі лічбавай трансфармацыі рэальнага сектара эканомікі. З 2020 года па гэтай праграме праводзіцца кансультацыйная падтрымка пры рэалізацыі пілотнага праекта лічбавай трансфармацыі машынабудаўнічага прадпрыемства. Плануецца, што атрыманыя вынікі і рэкамендацыі будуць выкарыстаны для лічбавай трансфармацыі прадпрыемстваў машынабудаўнічага комплексу ўсёй нашай краіны.

## Праграмы трэба рэалізоўваць сістэмна

**Намеснік старшыні Камітэта Савета Федэрацыі па эканамічнай палітыцы Іван АБРАМАЎ** назваў лічбавізацыю неабходнай умовай паспяховага развіцця дзяржавы і рынку. «Цяпер ідзе час лічбавізацыі — гэта данасць, якая цалкам ахапіла сучаснае грамадства. І нам вельмі важна бачыць і разумець, як разумна і эфектыўна выкарыстаць гэты рэсурс. Усе працэсы жыцця грамадства лічбавізуюцца і аўтаматызуюцца. У працэсе стварэння адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы Саюзнай дзяржавы лічбавізацыя становіцца каталізатарам кааперацыі», — падкрэсліў Іван Абрамаў.

Асноўнымі станоўчымі бакамі лічбавага развіцця Беларусі і Расіі ён назваў высокі чалавечы патэнцыял у IT-сферы, даступнасць інтэрнэту і мабільнай сувязі для насельніцтва і іх актыўнае выкарыстанне ў штодзённым жыцці.

**Намеснік дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Аляксей КУБРЫН** звярнуў увагу на тое, што праграмы Саюзнай дзяржавы патрэбна рэалізоўваць сістэмна. «Мы шмат працуем у галіне самых сучасных тэхналогій. Такіх праграм на сёння рэалізавана больш за 10, але яны рэалізоўваюцца кропкавымі метадамі. А вось па касмічным кірунку мы працуем сістэмна. І гэта важна. Сістэмнасць дазваляе прагназаваць работу ў галіне на 10—15 гадоў наперад. Напрацоўкі, якія былі зроблены па ўсіх папярэдніх праграмах, падштурхоўвалі адна адну да наступнага кроку», — сказаў ён.

Як прыклад ён прывёў праграму «Комплекс-СД», якая сёння ажыццяўляецца і з'яўляецца амаль стратэгічнай. Мяркуецца, што на базе названай праграмы будзе стварацца беларуска-расійская групоўка расійскіх спадарожнікаў, як мінімум у галіне дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі. Намеснік дзяржаўнага сакратара заўважыў: прыведзеная праграма паказвае настолькі высокія характарыстыкі, што ў будучым спадарожнікі змогуць будавацца на 10—15 гадоў наперад. І такі падыход трэба прымяняць у рабоце па іншых кірунках.

“ Сёння ў Беларусі створана сетка з 18 тэхнапаркаў, якія ахопліваюць усе рэгіёны нашай краіны і з'яўляюцца цэнтрамі прыцягнення новых вытворчасцяў і распрацовак. Таму супрацоўніцтва на рэгіянальным узроўні з Расіяй па гэтым кірунку мае вялікі патэнцыял.

«Калі казаць пра неабходнасць стварэння свайго праграмнага забеспячэння, то гэта павінна быць не імгненная задача, а ідэалагічна разлічаная на доўгачасовы тэрмін. Менавіта такім чынам, каб і ў далейшым гэта можна было выкарыстаць. Таму мы хацелі б разгледзець магчымасць комплекснага, ідэалагічнага аналізу, на падставе якога па ўсіх напрамках сфарміраваць доўгатэрміновую перспектыву. І тут немалаважна задзейнічаць патэнцыял нашых навуковых ведамстваў, бо толькі гэтыя структуры валодаюць поўным аб'ёмам інфармацыі па ўсіх галіновых напрамках. І на падставе прапрацоўкі напрамкаў распрацаваць ідэалогію, якую можна закласці як стратэгічную па галінах», — упэўнены Аляксандр Кубрын.

Падчас работы секцыі «Роля лічбавізацыі ў фарміраванні адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы Саюзнай дзяржавы» былі падпісаны камерцыйныя кантракты на суму звыш $35 млн. Спецыялісты спыніліся на меркаванні, што стварэнне скрозных лічбавых тэхналогій на базе сумесных распрацовак у розных сферах павінны стаць трывалым фундаментам для фарміравання адзінай эканамічнай прасторы Саюзнай дзяржавы.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# НАВУКА АДКАЗВАЦЬ НА ВЫКЛІКІ ЧАСУ

**Удасканаленне ўзаемадзеяння Расіі і Беларусі па пытаннях рэалізацыі саюзных праграм і навукова-тэхнічных праектаў у межах саюзных дагавораў абмяркавалі падчас VIII Форуму рэгіёнаў Расіі і Беларусі. Адпаведная секцыя прайшла 29 чэрвеня ў Прэзідэнцкай бібліятэцы.**


Фота БелТА.

Адкрываючы пасяджэнне секцыі, **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Сяргей РАЧКОЎ** адзначыў, што Расія займае асаблівае месца ў міжнародным супрацоўніцтве Беларусі ў навукова-тэхнічнай сферы.

Ён расказаў, што толькі ў межах Саюзнай дзяржавы рэалізавана 57 праграм у галінах касмічных даследаванняў, энергетыкі, новых матэрыялаў і нанатэхналогій, машына- і прыборабудавання, медыцыны, біятэхналогій, інфармацыйных і аграрных тэхналогій.

«У Беларусі ідзе бесперапынны працэс развіцця навукова-тэхнічнай і інавацыйнай сфер, у тым ліку з выкарыстаннем перадавога міжнароднага вопыту развіцця навукі і тэхналогій. У бягучым годзе ў нашай краіне дадзены старт дзяржаўнай праграме інавацыйнага развіцця на 2021—2025 гады, новым навукова-тэхнічным праграмам. Урадам пастаўлена задача рэалізаваць у рэгіёнах нашай краіны з улікам іх канкурэнтных пераваг інавацыйныя праекты па стварэнні высокатэхналагічных вытворчасцяў на аснове распрацовак беларускіх вучоных. Распрацаваная ў Беларусі інавацыйная прадукцыя мае вялікі патэнцыял для камерцыялізацыі як унутры краіны, так і за мяжой», — расказаў Сяргей Рачкоў.

Аднак, нягледзячы на станоўчую дынаміку высокатэхналагічных вытворчасцяў у рэальным сектары беларускай і расійскай эканомік, варта выводзіць работу у гэтым кірунку на больш высокі ўзровень. Як падкрэсліў сенатар, росту інавацыйнага патэнцыялу Беларусі і Расіі будзе спрыяць пераход да стварэння лічбавых платформаў як ключавых інструментаў лічбавай трансфармацыі традыцыйных галін і рынкаў, а таксама ўзаемадзеянне рэгіёнаў у галіне выкарыстання сучасных тэхналогій, распрацоўкі і серыйнай вытворчасці навукаёмістай прадукцыі. А галоўную ролю ў гэтым павінна адыгрываць інтэграцыя навуковых, адукацыйных і вытворчых арганізацый Беларусі і Расіі для стварэння і вываду на сусветны рынак новых сумесных тэхналогій і прадуктаў.

«Сёння працягваецца працэс фарміравання адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы Саюзнай дзяржавы, а таксама агульнай навукова-тэхналагічнай прасторы дзяржаў СНД. Міжнародныя дамовы і пагадненні, якія вызначаюць гэтыя працэсы, напрамкі, формы і механізмы двухбаковага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, павінны быць актуальныя, адпавядаць рэаліям эпохі лічбавізацыі», — звярнуў увагу Сяргей Рачкоў.

Прыярытэтная задача секцыі — прааналізаваць працэс рэалізацыі навукова-тэхнічных праграм, як у межах Саюзнай Дзяржавы, так і ў рамках СНД ды іншых міжнародных структур. Удзельнікі абмеркавалі пытанні інтэграцыі навуковых, адукацыйных і вытворчых арганізацый для стварэння і вываду на сусветны ўзровень агульных тэхналогій і прадуктаў.

Як адзначыў **старшыня Камітэта Савета Федэрацыі па міжнародных справах Грыгорый КАРАСІН,** Беларусь і Расія разам шмат чаго дасягнулі ў навукова-тэхнічнай сферы.

«За гады, якія прайшлі з моманту падпісання дамовы аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, шмат чаго ўдалося дамагчыся, умацаваць навукова-тэхнічныя і адукацыйныя кантакты. Пытанні навукі і адукацыі маюць важнае значэнне, таму што непасрэдна звязаныя з інтэлектуальным і творчым патэнцыялам, які ў немалой ступені вызначаюць здольнасць адказваць на выклікі часу, забяспечваць суверэнітэт і лідарства нашых краін, іх канкурэнтаздольнасць у сучасным свеце», — сказаў Грыгорый Карасін.

Сёння навуковае і навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва займае важнае месца і ў сістэме міжнародных адносін. Яно ажыццяўляецца на аснове двухбаковых і шматбаковых міждзяржаўных дагавораў і міжурадавых пагадненняў. А галоўная задача такога супрацоўніцтва заключаецца ў фарміраванні адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы дзвюх краін, у межах якой будуць забяспечаны гарманізацыя нацыянальных заканадаўстваў і роўныя магчымасці для беларускіх і расійскіх вучоных. Мяркуецца правядзенне сумесных даследаванняў па прыярытэтных для дзвюх краін напрамках. Да такіх напрамкаў Грыгорый Карасін аднёс інфармацыйныя тэхналогіі і электроніку, новыя матэрыялы і хімічныя працэдуры, экалогію і рацыянальнае прыродакарыстанне, тэхналогіі жывых сістэм, прафілактыку і лячэнне найбольш распаўсюджаных і небяспечных захворванняў, а таксама забеспячэнне радыкальнага павышэння эфектыўнасці сельскагаспадарчай вытворчасці.

Удзельнікі секцыі ў сваёй рабоце зрабілі акцэнт на разглядзе практыкі прымянення вынікаў навукова-даследчых і навукова-тэхнічных праграм і праектаў у рэальным сектары эканомікі, ажыццяўленні трансферу распрацаваных тэхналогій. Па выніках пасяджэння былі выпрацаваны прапановы па ўдасканаленні прававога рэгулявання супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў навукова-тэхнічнай сферы.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ЗАКОН І «ЛІЧБА»

**Падчас пасяджэння секцыі № 4 Форуму на тэму «Права і лічбавізацыя ў Саюзнай дзяржаве: перспектыўныя напрамкі» адбылася цікавая і змястоўная размова па шырокім коле пытанняў. У ёй удзельнічалі сенатары верхніх палат парламентаў Беларусі і Расіі, навукоўцы, спецыялісты дзяржаўных органаў кіравання, прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў.**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Сустрэча з расійскімі калегамі і аднадумцамі, няхай і ў рэжыме відэаканферэнцыі, своечасовая і вельмі актуальная. Свет імкліва змяняецца, асабліва ў сферы лічбавых тэхналогій. Так, яны прыносяць шмат карыснага для грамадства, эканомікі і звычайных людзей. Але разам з тым «лічба» тоіць у сабе і вялікую небяспеку. І сёння мы паспрабавалі знайсці адказы на ключавое пытанне: як ва ўмовах развіцця лічбавага грамадства захаваць баланс інтарэсаў дзяржавы і асобы, абараніць яе ад розных замахаў, у тым ліку і крымінальнага характару. Скажам, ад нядобрасумленнага выкарыстання персанальных даных, — сказаў **дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Беларусі Вадзім ІПАТАЎ.**

**Намеснік дзяржаўнага сакратара — член Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы Аляксей КУБРЫН** выказаўся за карэкціроўку нарматыўных прававых баз саюзнікаў. Цяпер яны рэалізоўваюць праграму па комплекснай абароне інфармацыйнай бяспекі «Парытэт». Увогуле, наспела неабходнасць падрыхтаваць стратэгічную канцэпцыю па пытаннях бяспекі ў Саюзнай дзяржаве, прапанаваў Аляксей Кубрын.

Размова на секцыі і надалей неаднойчы закранала тэму інфармацыйнай палітыкі і інфармацыйнай бяспекі Саюзнай дзяржавы. **Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ** гаварыў, што рэгіёны абедзвюх краін ужо перайшлі на лічбавізацыю. Можа, яшчэ не ў тым аб'ёме і не так сістэмна, як хацелася б, але, тым не менш, работа ідзе. У гэтым рэгіёнам дамагае і тое, што ў Беларусі і Расіі падыходзяць уніфікавана да выкарыстання лічбавых тэхналогій у рэгуляванні пэўных адносін, напрыклад, у сферы адукацыі, ахові здароўя і г. д. У Беларусі паспяхова развіваецца дзяржаўная праграма «Электроны ўрад». У яе рамках паступова пераводзіцца ў лічбавы фармат усё больш адміністрацыйных працэдур, іншых юрыдычных дзеянняў, што дазваляе нашым грамадзянам рэалізоўваць свае правы не выходзячы з дому, падкрэсліў сенатар.

**Першы намеснік старшыні Камітэта Савета Федэрацыі па канстытуцыйным заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Уладзімір ПАЛЯТАЕЎ** звярнуў увагу суразмоўнікаў на тое, што сёння ў выніку развіцця лічбавых тэхналогій адбываецца імклівая трансфармацыя ва ўсіх сферах жыцця грамадства. Паводле яго слоў, не засталася ўбаку і прававая сістэма. Таму невыпадкова ў юрыдычнай супольнасці ўсё часцей гучыць меркаванне: новыя інфармацыйныя тэхналогіі могуць істотна перайначыць усю сістэму права. Бо іх уздзеянне ўсё больш праяўляецца ў і выбарчым праве і працэсе, і ў працоўным праве, і ў адукацыі, і ў адміністрацыйным і працэсуальным праве, лічыць парламентарый.

Прамоўцы падчас дыскусіі неаднойчы казалі і пра тое, што працэсы лічбавізацыі аказваюць непасрэдны ўплыў на падрыхтоўку і прыняцце прававых нарматыўных актаў. Дадзенае пытанне набывае ўсё большую актуальнасць, асабліва ва ўмовах далейшага фарміравання інфармацыйнага грамадства. З'яўляюцца і новыя аб'екты права. Паралельна са звычайнымі папяровымі грашыма выкарыстоўваюцца электронныя плацежныя інструменты і лічбавыя грошы (крыптавалюта), лічбавыя платформы і экасістэмы, з'явіліся такія паняцці, як тэхналогія блокчэйн, смарт-кантракт і іншыя. Неабходна даць іх дакладнае тлумачэнне ў заканадаўстве. Для гэтага трэба прыняць новыя прававыя акты і ўнесці змяненні ва ўжо дзеючыя законы ў Беларусі і Расіі.

**Дэкан юрыдычнага факультэта БДУ Таццяна МІХАЛЁВА** засяродзілася на юрыдычных асаблівасцях фарміравання адзінай лічбавай прасторы Саюзнай дзяржавы, тых магчымасцях і рызыках, якія паўстаюць на гэтым шляху. Аб шляхах іх мінімізацыі казаў і **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Віктар ЧАЙЧЫЦ.** Ён, у прыватнасці, нагадаў аб магчымасцях, правах і абавязках грамадзян, асабліва маладых, пры выкарыстанні лічбавых тэхналогій у інтэрнэце.

А каб людзі дапускалі менш памылак, а тым больш не рабілі правапарушэнняў, прапанаваў наладзіць прававое навучанне насельніцтва з мэтай выхавання правільных паводзін у інфармацыйнай сферы. Бо няведанне закона не здымае адказнасці за злачынства.

**А вось кіраўнік Цэнтра кіравання рэгіёнам Маскоўскай вобласці Аляксандр ЦІХАНАЎ** заінтрыгаваў удзельнікаў секцыі сваім аповедам аб дзейнасці падначаленай яму структуры, пра плюсы выкарыстання шырокіх магчымасцяў лічбавізацыі. Дзякуючы ім дасягнуты істотныя здабыткі ў рабоце органаў мясцовага кіравання ў адукацыі, ахове здароўя, арганізацыі школьнага харчавання і г. д.

Падчас работы секцыі яе ўдзельнікі абмяняліся як вартым пераймання досведам, так і грунтоўна абмеркавалі праблематыку ўкаранення лічбавых тэхналогій у розных галінах грамадскіх адносін.

У ходзе пасяджэння былі выпрацаваны рэкамендацыі для зацікаўленых дзяржаўных органаў Беларусі і Расіі, напрыклад, максімальна гарманізаваць заканадаўчыя рашэнні ў сферы лічбавізацыі.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# ЛІЧБАВІЗАЦЫЯ АДКРЫВАЕ ДЛЯ МОЛАДЗІ НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

**У Беларускім універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі ў рамках VIII Форуму рэгіёнаў Расіі і Беларусі прайшло пасяджэнне секцыі «Моладзь анлайн: лічбавае асяроддзе будучыні», якая адна з самых шматлікіх на форуме. У ёй прынялі ўдзел каля 80 экспертаў.**


Фота БелТА.

У цэнтры ўвагі — пытанні магчымасцяў для моладзі ў эпоху лічбавізацыі, абмен вопытам выкарыстання новых тэхналогій у адукацыйнай дзейнасці, уплыў камунікацыйных тэхналогій у маладзёжным асяроддзі і інш.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Андрэй ІВАНЕЦ,** адкрываючы сустрэчу, адзначыў, што Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі дае магчымасць абмеркаваць пытанні, праблемы і выклікі, з якімі сутыкаюцца абедзве дзяржавы. «Сёння, ва ўмовах знешняга ціску, вызначаных санкцыйных абмежаванняў, вельмі важна выкарыстоўваць наш навуковы патэнцыял, каб выбудаваць інавацыйную эканоміку і забяспечыць годны ўзровень развіцця двух краін». А таксама расказаў пра ўкараненне лічбавых тэхналогій у розныя сферы жыцця грамадства: эканоміку, адукацыю, культуру, сацыяльную сферу.

Інфармацыйная эра зрабіла магчымых хуткія глабальныя камунікацыі, што значна змяніла форму сучаснага грамадства, адзначыў **першы намеснік міністра інфармацыі Андрэй КУНЦЭВІЧ.**

